ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дармовым дадаткам „Прафрух")

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „Зьвязда" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагародняя абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Зьвяш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. -адзану.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЬ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсэктар	13-80
Сэктар інфармацыі	13-80
Начны рэдактар	6-42
Галоўная кантора	7-81
Аддзел падпіскі	7-81
„ абвестак	7-81

Панядзелак, 3 верасня 1930 г.
№ 133 (4731)
Год выданьня — XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63

XIII ЗЬЕЗД КП(б)Б

Пад ЗНАКАМ БАЛЬШАВІЦКАЙ самакрытыкі

СПРЭЧКІ ПА СПРАВАЗДАЧЫ ЦК КП(б)Б

Прамова т. Фёдарава

Цэнтральны Камітэт у асноўным сказаў аб сваіх памылках у вядомай пастанове ад 17 красавіка г. г., па-бальшавіцку ўдарыў па канкрэтных посьпехах гэтых памылак і загібшчыках, якія супраціўляліся. Але ён недастаткова асаджваў некаторыя акруговыя арганізацыі, калі яны захапляліся колькасцнай калектывізацыяй і абвяшчалі сябе 100-процантнымі па калектывізацыі, калі яны заключалі дагаворы па сацыялістычным спаборніцтве ў справе калектывізацыі і г. д. Трэба сказаць, што і ў нашага полацкага акругоўага камітэту «акружылася ў галаве і ён прыняў няправільную пастанову аб сканчэньні калектывізацыі округі да канца 1930 году. Мне здаецца, што ЦК недастаткова рашуча ударыў па акруговым камітэце партыі. Але, ня гледзячы на ўсе перагібы і памылкі, пасьля дырэктыў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, наш Цэнтральны Камітэт, у першую чаргу пачаў выпраўляць тыя недахопы, якія мы зрабілі, і зараз ні ў якім выпадку нельга недаацэньваць тых 12 проц. гаспадарак, якія захаваліся ў калгасах. Гэта трэба расцэньваць, як вялізарнейшую перамогу КП(б)Б і як падставу для далейшага разьвіцьця нашага калгаснага руху.

Цэнтральны Камітэт партыі ў гэтым годзе практычна і рашуча паставіў пытаньне аб дапамозе асобным эканамічным і культурным галінам округ Беларусі. У гэтым годзе, як ніколі, Цэнтральны Камітэт партыі практычна, рэальна вырашыў гэтыя пытаньні і зараз у сувязі з гэтым праводзіцца рад мерапрыемстваў, якія павінны будуць палепшыць эканамічнае і культурнае становішча асобных округ, якія ў параўнаньні з іншымі округамі зьяўляюцца адсталымі.

Асобным цэнтральным нашы органы ня ў гэтай пары канчаткова не вырашылі пытаньня аб тым будаўніцтве, якое павінна праводзіцца ў гэтым годзе. Ня ў гэтага часу, таварышы, няма вызначаных аб'ектаў, няма вызначаных канкрэтных месц, дзе будаваць і г. д. А будаўнічы сэзон хутка праходзіць. Калі мы ў гэтым пытаньні з боку ЦК партыі ня будзем мець надлежнай установкі, якая павінна забясьпечыць адказнасьць нашых паасобных працаўнікоў, нашых цэнтральных ведамстваў, калі мы ня будзем мець сыстэматычнай праверкі тых заданьняў, якія мы даем па выкананьні на пагранічнай паласе і адсталых округах,—мы зможам мець пагрозу зрыву паасобных мерапрыемстваў.

Другое пытаньне — гэта пытаньне аб ролі нашага друку і кіраўніцтве ім з боку ЦК нашай партыі. Усім нам вядома, што друк праводзіць вялікую работу па дапамозе партыйным арганізацыям у барацьбе з выкрыцьцём розных памылак, перагібаў і ў разгортваньні самакрытыкі ў барацьбе за генэральную лінію партыі. Але трэба сказаць, што часта нашы газэты дапускаюць вялікія памылкі і адмаўляюцца ад выпраўленьня гэтых памылак. Я маю на ўвазе газэту «Чырвоная Зьмена». Гэта газэта яшчэ ў студзені дапусьціла вялікую памылку — быў зьмешчан артыкул пад загалоўкам «Астраханшчына на Полаччыне». Абвінавачалі Полацкае акруговае кіраўніцтва ў змазваньні правага ўхілу, у змазваньні чысткі партыі і ў канцы паставілі крыж над пастановамі, якія былі вынесены пленумам АК і АКК. Паводле нашага настаяньня, ЦК і ЦКК праводзіў агляд Полацкай акруговай арганізацыі. Праўда, канчатковых вынікаў ЦК па абсьледваньні работы заслухаць не ўдалося, але заслухалі даклад акруговай кантрольнай камісіі і ЦКК, якая праводзіла агляд, і не адзначыла ніякай астраханшчыны. Адначасова ЦКК не паказала і гэтай газэце — «Чырвонай Зьмене» — аб тым, што нельга ставіць крыж над палітычнай рэзалюцыяй цэлай акруговай партыйнай арганізацыі. Мы пасьля вынесьні сваю пастанову і паслалі артыкул зьмясьціць у друку і ў гэтым пытаньні вялі спэцыяльную размову. З тай пары прайшло шмат часу, але-ж да гэтага моманту наша пастанова не зьмяшчаецца.

Трэба сказаць, што газэта «Чырвоная Зьмена» — маленькая, але зубастая, газэта добрая, яна ставіць пытаньні рэзка.

І яшчэ, таварышы, я хачу зьвярнуць увагу на адну газэту, на газэту «Савецкая Беларусь», якая ў адным з нумароў зьмясьціла артыкул аб тым, што Полацкая округа працуе на карысьць кулака. Справа зводзіцца да таго, што ў Менскай акрузе 14 проц. абагуленага насельня, а па Полацкай — 17,3 проц. Таму Полацак працуе на карысьць кулака і з гэтага повуду даецца вялікі апыляг. Мы пратэставалі супроць гэтага абвінавачаньня, і ЦК партыі зрабіў належную заўвагу газэце. Я лічу, што трэба больш крытыкаваць наш друк.

Прамова т. Пятушкова

ЦК КП(б)Б над кіраўніцтвам ленінскага ЦК УсеКП(б) ва ўсёй сваёй рабоце праводзіў правільную, палітычную і арганізацыйную лінію. КП(б)Б за пэрыяд ад 12 да 13 зьезду мае вялікія дасягненьні. Рост партыі паказаў, што рабочая кляса ўсьвядоміла нашу генэральную лінію. Пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) ЦК КП(б)Б вёў рашучую барацьбу на два франты — з правым ухілам, як галоўнай небясьпекі на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва, і «левымі» загібамі, барацьбу супроць нацыянал-дэмакратаў. ЦК своячасова і рашуча вёў барацьбу супроць правых апартуністычных поглядаў тав. Чарвякова. У гэтай барацьбе прымала актыўны ўдзел і Менская арганізацыя і Менскі акруговы партыйны камітэт. Цэнтральны Камітэт своячасова прызнаў дапушчаныя памылкі ў галіне калектывізацыі. Ён рашуча і своячасова выправіў гэтыя памылкі. ЦК рашуча праводзіў лінію на выпраўленьні скажэньняў лініі партыі і дапушчаных загібаў.

Я лічу, што трэба завастрыць увагу вакол далейшага выпраўленьня загібаў, якія дапускаліся арганізацыямі на мясцох у галіне калектывізацыі. Рашучым экзаменам у далейшай калектывізацыі вьявіцца ўборачная кампанія. Гэта кампанія, якую мы будзем мець у нашых калгасах, вьявіцца пераконваючым доказам для бяднякоў, серадняцкіх мас, якія не пайшлі ў калгасы, што яны павінны быць у калгасах.

Мы зараз маем недастатковае завастрэньне ўвагі рабочых мас вакол пытаньняў калектывізацыі. Мы прызналі няправільнай пабудову структуры шэфскіх арганізацый. Мы перабудавалі гэтыя шэфскія арганізацыі, як непрыстасаваныя да тэмпаў калектывізацыі.

Але, што мы бачым зараз у новых арганізацыях, у таварыствах па садзейнасьці калектывізацыі? Атрымліваецца, што там яшчэ адсутнічае штодзённая плянавая работа.

Гаспадарчыя труднасьці высунулі востра праблему разьвіцьця садова-гароднічай гаспадаркі. Белсадсаюз, які кіруе гэтай справай, скрыўляе лінію партыі. Праводзячы сваю работу, ён аб'ектыўна падрывае калектывізацыю. Калі сёньня калгасьнікі здаюць 2.000 аргуркоў па расцэнцы 20 кап. шт., дык фактычна яны атрымліваюць ня поўнасьцю, г. зн. 31 проц. ідзе на розныя накладныя расходы, вылічэньні і г. д. Памойму, такая палітыка павінна быць перагледжана адпаведнымі парторганамі.

Прамова т. Аляксандрава

У адносінах забесьпячэньня рабочых тут, у БССР, на сёньняшні дзень ня ўсё абстаіць добра. Яно далёка яшчэ не задавальняе тых патрабаваньняў, якія ставяцца на сёньняшні дзень. З усёй зілай трэба ўзяцца за ЦРК, за перабудову работы каапэратываў з тым, каб нам дабіцца лепшага абслугоўваньня і лепшай якасьці тавараў, каб зьнішчыць недапушчальныя адносіны да разьмерка каваньня прадуктаў. Трэба на сапраўднаму ўзяцца за ўзмацненьне каапэратываў, за бязьлітасную чыстку апарату, сур'ёзна ўзяцца за перабудову работы каапэрацыйных устаноў.

Зараз аб выкананьні пасэўнага плану. Тав. Гей у сваім дакладзе гаварыў аб 12 проц. папырэньні плошчы і сказаў, што за гэту справу будучы наш ЦК КП(б)Б у бліжэйшы час павінен узяцца з усёй рашучасьцю. Мы гаворым аб перагібах, але гэтыя перагібы яшчэ ў поўным сэнсе ня зжыты, і таму партыйным арганізацыям трэба будзе весьці рашучую барацьбу па іх зьнішчэньні. Мы зараз стаім перад асеньняй кампаніяй. Пытаньне аб асеньняй кампаніі таксама заслугоўвае сур'ёзнае ўвагі. Гэтым пытаньням трэба заняцца, а галоўнае мы павінны ўмацаваць добрымі работнікамі партыйныя вясковыя ячэйкі.

Расьце малады актыў партыі. Зараз патрабуецца папырэньне вылучэньня гэтага маладога вырастаючага партыйнага актыву на кіруючую партыйную работу. Трэба зрабіць усё неабходнае для актывізацыі ўдзелу ўсіх членаў бюро ў рабоце камітэту, паблізіць Цэнтральны Камітэт КП(б)Б да акруговых парт-арганізацый.

Трэба арганізаваць сыстэму ўнутрыпартыйнай палітычнай інфармацыі. За справаздачны пэрыяд, я лічу, яна была ў асноўным дастатковай, але трэба яе зрабіць больш сыстэматычнай.

Прамова т. Жыгуновіча

Аб камсамольскай арганізацыі. Яна расьце з кожным днём. Але ёсьць і рад адмоўных фактаў. Камсамольцы ў пэхах зьяўляюцца ізжэ-ударнікамі. Ёсьць такія факты, калі камсамольцы атрымліваюць прэмію за ўдарніцтва, а потым ламаюць машыну, робяць прагулы і інш. Гэта паказвае, што ў цэхах камсамольцамі ня кіруе партыйная арганізацыя.

Палітычны ўзровень нашых камсамольцаў слабы. Гэта тлумачыцца тым, што школы ня былі прыстасаваны да ўзроўню ведаў камсамольцаў. Камсамольцы малапісьменныя, а іх пасылаюць у партшколу ў той час, калі яны ня ўмеюць чытаць.

Трэба адзначыць, у якіх жыльлёвых умовах жывуць камсамольцы. У нас уся ўвага зьвернута на сямейных, а на адзіночак - камсамольцаў ніякае ўвагі не зварачаецца. Камсамольцы жывуць у дамох, дзе яны знаходзяцца пад уплывам рэлігійных бацькоў або гаспадара ці гаспадыні. Да гэтага часу па было зьвернута ніякай увагі на тое, каб пабудаваць для маладняка агульнае памяшканьне.

Аб перабудове камсамольскай работы. Зараз арганізаваны сэктары, але ячэйкі ня ўмеюць працаваць у іх. Райком і акругком таксама ня ўмеюць кіраваць гэтымі сэктарамі.

У нас ёсьць дзіцячыя арганізацыі, але на сёньняшні дзень шмат дзяцей ходзяць яшчэ па вуліцах, хуліганяць. Дастатковага выхаваньня сярод дзяцей няма. Бацькі знаходзяцца на працы, а дзіця прыходзіць са школы і ня мае прытулку. Трэба зьвярнуць увагу на дзяцей. Наша бяда заключаецца ў тым, што ў школе амаль няма новага палітычнага выхаваньня, каб магчыма было ў пралетарскім духу выхоўваць дзяцей. Для гэтага трэба адкрываць курсы, прыцягваць туды лепшых таварышоў, лепшых работнікаў, якія-б у будучым далі не старых інтэлігентаў настаўнікаў, а новых.

Прамова т. Арнольдава

Транспарт ператвараецца, у параўнаньні з ростам асобных зьвеньняў усе цашае народнае гаспадаркі, у вузкае месца.

XV зьезд партыі, даючы ўстаноўку аб шляхох разьвіцьця сацыялістычнага, адзначаў:

«Стварэньне транспарту, пераход да рашучай перабудовы і рацыяналізацыі павінен добра зьвярнуць увагу на карэнную рэканструкцыю транспартнай гаспадаркі, рацыяналізацыю яго работы паводле тыпу найбольш перадавых у тэхнічных адносінах краін».

Мы маем у гэтых адносінах поўную рэарганізацыю нашага транспартнага кіраўніцтва.

Мы пераходзім на дэцэнтралізацыю, пераходзім на раёны, скарачаем штаты, атрымліваем больш вызначанасьці і формы праўленьня набліжаюцца да тыпу прамысловасьці.

Мы мелі прарывы ў падрыхтоўцы кадраў, і на транспарце ў нас яўсім няма ніякіх кадраў: сьлесараў, машыністых. Калі да гэтага дадаць, што да бягучых асеньніх перавозак мы будзем мець 50 проц. павялічэньня грузавых патокаў у параўнаньні з мінулым годам, дык Беларусь, для якое транспарт да гэтага часу не прадстаўляў а сябе вузкага месца, дык зараз у гэтым годзе будзе вузкім месцам.

Трэба адзначыць, што, праўда, мы павінны 10 мільёнаў рублёў пасьвяцець перавыдаткаваць на працягу бліжэйшых 2-х месяцаў як на складзкія памяшканьні, так і на цэлы рад тэхнічных удасканаленьняў, каб абслужыць найбольш цяжкія вучасткі, якімі будуць зьяўляцца Магілеў, Ворша, Віцебск, г. зн. асноўныя вузлы Беларусі.

Калі да гэтага дадаць дрэнную сувязь з месцамі і кіраўніцтва транспарту месцамі, успомніць, што калі на ўсходніх сэмафорах граніцамі зьяўляюцца нашы саюзныя рэспублікі, а на заходніх сэмафорах мы мяжуемся з імпэрыялістычным сьветам, дык пытаньне аб увазе транспарту Беларусі становіцца, відома, яшчэ актуальнейшым.

Да гэтага часу сувязі з партыйнымі арганізацыямі і адпаведнай дапамогі партарганізацыям транспарту мала было.

З прычыны таго, што транспарт становіцца вузкім месцам, задача заключаецца ў тым, каб дырэктывы XV зьезду партыі, дырэктывы пленумаў ЦК аб тым, што транспарт павінен таксама стаць магутным вагаром сацыялістычнай рэканструкцыі нашай краіны і нашай народнай гаспадаркі, мелі належную ўвагу з боку партарганізацый і большую дапамогу для таго, каб у надыходзячыя асеньнія перавозкі перамагчы тыя труднасьці, якія змогуць сустрэцца.

Прамова т. Маўшовіча

Лінія ЦК КП(б)Б была правільнай на працягу гэтага вялікага пэрыяду, які мы прайшлі ад 12 да 13 зьезду КП(б)Б. Асабліва апошняя справаздачна-перавыбарчая кампанія партыйных органаў з усёй рашучасьцю падкрэсьлівала правільнасьць лініі ЦК КП(б)Б.

Я, таварышы, хачу спыніцца на пытаньні культурнай рэвалюцыі. Лёзунг КП(б)Б аб культурнай рэвалюцыі паасобнымі зьвеньнямі і арганізацыямі не праводзіцца ў жыцьцё. Мы маем рад фактаў, якія сьведчаць, што пытаньнем культурнай рэвалюцыі падаецца ніяначная ўвага.

Другое пытаньне—аб кадрах. Культурны фронт зьяўляецца фронтам самым незабясьпечаным у сэнсе кадраў. На асьветніцкім фронце, асабліва ў прымежных округах, мы маем такія выпадкі, калі на чале асьветніцкай справы стаяць ня проста чужыя элементы, а былыя людзі, пятлюраўскія афіцэры, людзі, якія адкрыта варожа да нас адносяцца. Гэтыя людзі вядуць разбуральную работу сярод падрастаючага пакаленьня.

А калі ўзяць другую галіну асьветніцкай справы—палітасьветную галіну, дык мы бачым, што нашы хаты-чытальні яшчэ не займаюць таго месца, якое яны павінны заняць, як культурныя цэнтры на вёсцы. Звычайна яны былі на замку, а хатнік праводзіў сход нейдзе за дзесяць кілёмотраў. Хаты-чытальні не зьяўляюцца тымі цэнтрамі, якія-б прапагандавалі задачы, што стаяць перад партыяй на вёсцы. Раёньне ЦК УсеКП(б) аб палітасьветных кадрах, аб увазе палітасьветным і таму партыйным арганізацыям трэба будзе весьці рашучую барацьбу па іх зьнішчэньні. Мы зараз стаім перад асеньняй кампаніяй. Пытаньне аб асеньняй кампаніі таксама заслугоўвае сур'ёзнае ўвагі. Гэтым пытаньням трэба заняцца, а галоўнае мы павінны ўмацаваць добрымі работнікамі партыйныя вясковыя ячэйкі.

Расьце малады актыў партыі. Зараз патрабуецца папырэньне вылучэньня гэтага маладога вырастаючага партыйнага актыву на кіруючую партыйную работу. Трэба зрабіць усё неабходнае для актывізацыі ўдзелу ўсіх членаў бюро ў рабоце камітэту, паблізіць Цэнтральны Камітэт КП(б)Б да акруговых парт-арганізацый.

Трэба арганізаваць сыстэму ўнутрыпартыйнай палітычнай інфармацыі. За справаздачны пэрыяд, я лічу, яна была ў асноўным дастатковай, але трэба яе зрабіць больш сыстэматычнай.

Нацыянал-дэмакратызм знаходзіць сабе месца ва ўстановах культурнага фронту. Тыя факты аб вылазках нацыянал-дэмакратызму, якія мы мелі, адбіваліся на самым небясьпечным месцы—на фронце культурным. Тут прыводзіліся факты гэтых вылазак у часе сьвяткаваньня пяцігодзьдзя БДВ і г. д. Усё гэта сьведчыць аб неабходнасьці яшчэ большага замацаваньня гэтага фронту.

Я хачу напомніць тое, што гаварылі на XII зьездзе КП(б)Б, што часам праз календары і іншыя масавыя выданьні прабуюць правалакаць прышчэпаную ідэалёгію. Калі хто сачыў за нашым календаром, ён заўважыў, што ў лістку за 10 мая праводзіцца ідэалізацыя Данії, адкуль Прышчэпаў прыводзіў прыклады таго, як трэба будаваць сельскую гаспадарку. У гэтым лістку Данія падносіцца, як «шчасьлівая краіна», дзе ня трэба праводзіць пралетарскай рэвалюцыі, дзе сялянства жыве бясьпечна, дзе сялянства бяднейшае, дзе яму і ня трэба думаць аб пралетарскай рэвалюцыі. Гэта сьведчыць аб тым, што агенты Прышчэпава—правыя ўхілістыя—яшчэ знаходзяць сябе месца ў нашых апаратах.

Апошняе—аб перабудове нашага партыйнага апарату. Калі ў акруговых партыйных апаратах хоць шыльды замянілі—замест аддзелаў напісалі—сэктары, дык у раённых камітэтах нават і шыльдаў не перамянілі. Там працуюць пастарынцы, ніякага прыстасаваньня раёнпага партыйнага апарату да выкананьня чарговых задач няма.

Прамова т. Левіта

Таварышы, тут абвінавачваюць ЦК партыі ў адносінах асобных памылак у справе калектывізацыі. Я лічу, што нам трэба часткова абвінавачваць і сябе, бо мы самі па калектывізацыі зрабілі вялікія памылкі. Вось, напрыклад, у нас, у Гомелі, паслалі камуністых у вёску для правядзеньня калектывізацыі. Калі-ж зьявіўся артыкул т. Сталіна, дык адзін таварыш сказаў, што гэты артыкул трэба праверыць. Апрача таго, многія камуністыя часта ня хочуць прызнаваць сваіх памылак. Калі гаварыць, што Цэнтральны Камітэт партыі рабіў асобныя памылкі, дык трэба сказаць, што і мы зрабілі памылкі, калі пасылалі такіх таварышоў на работу, якія ня ўмелі праводзіць правільнай лініі нашай партыі.

У адносінах вазнізацыі я лічу, што т. Гей павінен быў сказаць больш. У нас на прадпрыемствах арганізаваны баявыя атрады, але трэба сказаць, што за апошні час з імі не праводзіцца ніякай работы. Партыйная арганізацыя не бярэ ўдзелу ў кіраўніцтве вазнізацыяй.

Аб нацыянал-дэмакратызьме. Я вам раскажу адзін выпадак, які быў у нас, у Гомелі. Прыехала з Масквы рэвізія, якая рэвізавала Белпадтэхнікум. І вось рэвізор не заўважыў, што там ёсьць паўнейшы нацыянал-дэмакратызм, што там існуе такі лёзунг, як «ніхай жыве вольная Беларусь». Ён заблытаў і акругком. І акругком да апошняга моманту не заўважыў, што ў Белпадтэхнікуме маюць месца правы нацыянал-дэмакратызму.

Адносна кадраў. Трэба пасылаць вучыцца камуністых. Але калі мы гаворым аб перагібах, але гэтыя перагібы яшчэ ў поўным сэнсе ня зжыты, установам ня выцівае.

Нацыянал-дэмакратызм знаходзіць сабе месца ва ўстановах культурнага фронту. Тыя факты аб вылазках нацыянал-дэмакратызму, якія мы мелі, адбіваліся на самым небясьпечным месцы—на фронце культурным. Тут прыводзіліся факты гэтых вылазак у часе сьвяткаваньня пяцігодзьдзя БДВ і г. д. Усё гэта сьведчыць аб неабходнасьці яшчэ большага замацаваньня гэтага фронту.

Я хачу напомніць тое, што гаварылі на XII зьездзе КП(б)Б, што часам праз календары і іншыя масавыя выданьні прабуюць правалакаць прышчэпаную ідэалёгію. Калі хто сачыў за нашым календаром, ён заўважыў, што ў лістку за 10 мая праводзіцца ідэалізацыя Данії, адкуль Прышчэпаў прыводзіў прыклады таго, як трэба будаваць сельскую гаспадарку. У гэтым лістку Данія падносіцца, як «шчасьлівая краіна», дзе ня трэба праводзіць пралетарскай рэвалюцыі, дзе сялянства жыве бясьпечна, дзе сялянства бяднейшае, дзе яму і ня трэба думаць аб пралетарскай рэвалюцыі. Гэта сьведчыць аб тым, што агенты Прышчэпава—правыя ўхілістыя—яшчэ знаходзяць сябе месца ў нашых апаратах.

Апошняе—аб перабудове нашага партыйнага апарату. Калі ў акруговых партыйных апаратах хоць шыльды замянілі—замест аддзелаў напісалі—сэктары, дык у раённых камітэтах нават і шыльдаў не перамянілі. Там працуюць пастарынцы, ніякага прыстасаваньня раёнпага партыйнага апарату да выкананьня чарговых задач няма.

Прамова т. Каждана

Аб пасьпяховых выніках сацыялістычнага будаўніцтва кажуць першыя вынікі нашай гаспадарчай пяцігодкі, усё больш узрастаючая актыўнасьць рабочых на прадпрыемствах, сацыялістычнае спаборніцтва, пераход на вышэйшыя формы гэтага сацыялістычнага спаборніцтва, ударніцтва—усё гэта зьяўляецца лепшым доказам правільнасьці генэральнай лініі нашай партыі па сацыялістычным будаўніцтве.

Цэнтральны Камітэт нашай партыі прызнаў свае асобныя памылкі, дапушчаныя ў адносінах калектывізацыі, і тым самым правільна арыентаваў парт-арганізацыі на выпраўленьні гэтых памылак, чым Цэнтральны Камітэт паступіў па-бальшавіцку.

Прамова т. Вэндэ

Гомельская арганізацыя атрымала вялікі ўрок у справе самакрытыкі. Мы ў Гомелі зрабілі рад памылак у справе разгортваньня самакрытыкі. «Соль» нашых памылак заключаецца ў тым, што пераважна ўдарылі па апартуністых, якія бацца самакрытыкі і якія ня толькі не баяцца, але душылі самакрытыку. Мы своячасова ня ўдарылі і не закінулі да парадку гэтых людзей і ЦК КП(б)Б павінен быў умяшацца для таго, каб уладзіцца за гэтыя памылкі пабальшавіцку і пачалі іх выпраўляць.

Я ня згодзен з т. Мазурам, калі ён гаворыць, што самакрытыка ў нас ужо пачала разгортвацца. Мы разгортваем, пакожны рабочы займаўся самакрытыкай, бо для членаў партыі і ўсяе рабочае клясы самакрытыка патрэбна, як паветра, бо без яе мы ня можам рухацца, бо без яе мы ня можам будаваць сацыялізм, без яе мы ня можам выпраўляць сваіх памылак. Я павінен сказаць, што калі была вынесена пастанова ЦК і ЦКК, мы ў Гомелі на сто процантаў прызналі свае памылкі. Трэба сказаць, што ЦК партыі правільна прыняў рад пастаноў і арыентаваў.

Па лініі калектывізацыі, у адносінах перагібаў мы стаім на адным з апошніх месц. Па выкананьні прамфінпляну мы таксама, хадзі і з вялікімі труднасьцямі, і таму партыйным арганізацыям трэба будзе весьці рашучую барацьбу па іх зьнішчэньні. Мы зараз стаім перад асеньняй кампаніяй. Пытаньне аб асеньняй кампаніі таксама заслугоўвае сур'ёзнае ўвагі. Гэтым пытаньням трэба заняцца, а галоўнае мы павінны ўмацаваць добрымі работнікамі партыйныя вясковыя ячэйкі.

Расьце малады актыў партыі. Зараз патрабуецца папырэньне вылучэньня гэтага маладога вырастаючага партыйнага актыву на кіруючую партыйную работу. Трэба зрабіць усё неабходнае для актывізацыі ўдзелу ўсіх членаў бюро ў рабоце камітэту, паблізіць Цэнтральны Камітэт КП(б)Б да акруговых парт-арганізацый.

Трэба арганізаваць сыстэму ўнутрыпартыйнай палітычнай інфармацыі. За справаздачны пэрыяд, я лічу, яна была ў асноўным дастатковай, але трэба яе зрабіць больш сыстэматычнай.

Пастанова XIII зьезду КП(б)Б

па дакладу Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі КП(б)Б

Заслухаўшы справаздачны даклад т. Калніна аб рабоце ЦКК КП(б)Б XIII зьезду КП(б)Б цалкам і поўнасьцю ўхваляе палітычную лінію і практычную дзейнасьць ЦКК КП(б)Б, якая поўнасьцю адпавядае генэральнай лініі нашай партыі

ДЗЕНЬНІК ЗЬЕЗДУ

На ранішнім пасяджэньні 8-га чэрвеня працягваліся спрэчкі па дакладу **т. Калніна.** Выступалі ў спрэчках т. т. **Караленка, Сташэўскі, Згле, Юзьбік, Жолудзеў, Земнэк, Шафранскі, Канакоцін, Ляўкоў, Тамкоў, Батва, Зелянкоўскі, Бэйлін, і Курцік.**

Усяго на справаздачы ЦКК КП(б)Б выказалася 36 таварышоў.

На гэтым-жа пасяджэньні заслухана заключнае слова **т. Калніна.**

Зьезд у аднагалосна ўхваленай пастанове цалкам і поўнасьцю ўхваліў палітычную лінію і практычную дзейнасьць ЦКК КП(б)Б. Для распрацоўкі рэзалюцыі па справаздачы ЦКК КП(б)Б зьездам абрана камісія ў наступным складзе: т. т. **Трылісер, Калнін, Калодка, Зелянкоўскі, Згле, Міртаў, Шафранскі, Курцік, Мундаў Клюмчук, Туманаў, Смаляк, Акстолкер, Рыхтэр, Батва, Канакоцін, Жуковіч, Сташэўскі, Валодзька, Шукевіч, Ашаровіч, Дубіна, Зубрыцкі, Карнейчык, Шлон, Жан, Ражэцкі, Дамброўскі, Амбрамунас, Хацкевіч, Вульфсон, Лібамірскі, Кудзелька, Жвалін Тамкоў, Жолудаў, Сапун.**

У канцы ранішняга пасяджэньня да будынку дому культуры, у якім праводзіць свае работы зьезд, прыбылі чырвоны абоз, арганізаваны калгасьнікамі Самахвалавіцкага раёну, як прывёз 6.000 пуд бульбы і 500 пуд збожжа ў падарунак зьезду.

Ад імя калгасьнікаў Самахвалавіцкага раёну зьезд віталі **т. т. Будай Лешын і Давідчык.** На прывітаньні калгасьнікаў ад імя зьезду адказвае **т. Чарвякоў.**

На вячэрнім пасяджэньні з дакладамі аб выкананьні пяцігодовага плану прамысловасьці выступілі **т. т. Бэнэк і Грысевіч.**

Зьезд віталі калгасьнікі Клімаўшчыны **тав. Сідарэнка** (калгас «Камуна Магілеўшчыны») і **тав. Раманенк** (калгас «Ленінскі Шлях»). На прывітаньні калгасьнікаў ад імя зьезду адказваў т. **Хацкевіч.**

Кожны партыйны калектыў—бальшавіцкі арганізатар мас на барацьбу за прамфінпляну

За штодзённае баявое парткіраўніцтва сацыялістычным спаборніцтвам

Сьмела і рашуча перабудаваць работу

РАЗГОРТВАЕМ ПРАПРАЦОЎКУ

Для прапрацоўкі тэзісаў да XVI зьезду ЎсеКП(б) па **Магілеўскім** раёне створана 12 гурткоў, якія ахапляюць усіх членаў і кандыдатаў партыі. Кіраўнікамі вылучаны т. т. з раённага партактыву. Некаторыя гурткі распачалі работу. Прапрацаваны тэзісы т. **Якаўлева** падрабязна. Кожны пункт шырока абгаворваўся. Разам з дзелавымі, добрымі прапановамі з боку партыйнаў і беспартыйных былі і такія выступленьні, як «калектывізацыя паела ўсіх кароў», «дзякуючы калектывізацыі сяляне разбазарваюць жывёлу» (пастаўнік **Бардоўскі**). Сход даў рашучы адпор гэтай кулацкай думцы. Тэзісы ягэйкамі ўхваляюцца поўнасьцю.

Трэба сказаць, што камсамольская арганізацыя і дагэтуль не прыступіла да прапрацоўкі тэзісаў да партзьезду.

Шчарбакоў.

Дабіцца ліквідацыі прарыву

(Менск)

Партыйная ячэйка шчаціннай фабрыкі не зьявілася арганізатарам барацьбы за прамфінпляк. Партыйная ячэйка ня здолела мабілізаваць рабочую масу на змаганьне за выкананьне вытворчай праграмы. У выніку на фабрыцы мае месца сур'ёзны прарыў у выкананьні прамфінпляну. Прамфінплян выкананы толькі на 64,6 проц.

Фабрыка ў значнай ступені працуе па экспарт. І таму прарыў у выкананьні вытворчай праграмы зьяўляецца сур'ёзным ударам па экспартным пляне. Партыйная ячэйка гэтага ня ўлічыла. Бюро не заўважыла своячасова прарываў па фабрыцы. Замест таго, каб навярнуцца «тварам да вытворчасьці», бюро ячэйкі ў большасьці займалася дробнымі справамі. Напрыклад, у той час, калі на фабрыцы вынікаў вялікі прарыў, бюро патраціла многа часу на вырашэньне такога пытаньня, як чаму адна камсамолка на першамайскім вечары адмовілася танцаваць з чырвонаармейцам. Асобныя камуністыя і камсамольцы ня прымаюць удзелу ў сацыялістычным спаборніцтве. Група партыйцаў і камсамольцаў нават падала заяву аб зьніжэньні норм, для таго, каб павялічыць свой заработак.

Зараз у рабоце ячэйкі паступіў некаторы арух. Гэта трэба замацаваць. Партыйная ячэйка павінна паставіць перад сабой балвую задачу дабіцца ў што-б ні стала на фабрыцы поўнае ліквідацыі прарыву да XVI зьезду УсеКП(б).

Крок на месцы

Парткіраўніцтва фабрыкі «Вэзуві» ня здолела стаць на чале актыўнасьці рабочай масы.—Марудныя тэмпы перабудовы работы прывялі да апартунізму на практыцы.—Такое кіраўніцтва трэба аздаравіць

У выкананьні прамфінпляну мы маем пагражаючае становішча. Крывая ідзе ўніз. Нават у параўнаньні з мінулымі месяцамі, калі рад цэхаў знаходзіўся на чорнай дошцы, справа пагоршылася. Вось лічбы: у маі па запалках выкананы прамфінплян на 85,26 проц., а ў красавіку—на98,5 проц. Па фанэрным заводзе выкананы—на 86,6 проц. Аб якасных паказальніках і гаварыць ня прыходзіцца. Калі параўнаць лічбы з прынятым сацыялістычным дагаворам, то прарыў атрымліваецца яшчэ большы.

Чым гэта тлумачыцца? Чаму з кастрычніка месяца «Вэзувэ» працуе сыстэматычна з прарывамі? Бязумоўна, гэта ні ў якім разе ня тлумачыцца аб'ектыўнымі ўмовамі. Мелі-ж мы на гэтай фабрыцы пры тых-жа ўмовах, якія існуюць зараз, у сакавіку месяцы выкананьне прамфінпляну на 110,78 проц. ГЭТА ТЛУМАЧЫЦЦА ВЫКЛЮЧНА НЕДАСТАТКОВЫМ ПАРТЫЙНЫМ КІРАЎНІЦТВАМ. ПАРТКАЛЕКТЫЎ НЯ ЗДОЛЕЎ ПАСАПРАЎДНАМУ ПЕРАБУДАВАЦЬ УСЮ СВАЮ РАБОТУ, СТАЦЬ НА ЧАЛЕ ЎЗРОСШАЙ АКТЫЎНАСЬЦІ РАБОЧАГА КАЛЕКТЫВУ.

Мы маем няўвязку паміж цэхамі, вынікам гэтага зьяўляецца сыстэматычныя тэхнічныя прастоі на фабрыцы, якія даходзяць па асобных цэхах да 4-х гадзін у дзень. У сакавіку месяцы на фабрыцы было 893 чалавека-гадзіны і па фанэрным заводзе—159 чалавека-гадзін тэхнічных прастояў, у маі месяцы за 20 дзён мелася тэхнічных прастояў па фабрыцы—3.043 чалавека-гадзін і па фанэрным заводзе—431 чалавека-гадзін.

Адзінаначальне не ажыцьцяўляецца. Кіраўніцтва ўдарнымі брыгадамі і камунамі няма. Прамфінплян не даведзен да цэху, транспартыра, варштата. У гаходзяць на работу 20 накатчыкаў, што ня рабочыя займаюцца рвацтвам, а цэхавая парт'ячэйка не арганізоўвае рабочых для рашучага адпору такім настроям. Накатачны цэх зусім не забясьпечан камуністымі.

Замест сапраўднай арганізацыі мас партыйнае кіраўніцтва займалася разважаньнямі на працягу цэлых 5-ці месяцаў. 16-га студзеня на дакладу дырэктара фабрыкі ХОЎКІНА бюро парткалектыву прыняло пастанову аб «нездавальняючым выкананьні вытворчай праграмы за першы квартал» і што прычыны ўвага парт'ячэек да пытаньняў мабілізацыі рабочых мас для сапраўднага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдзелу ў гэтым у першую чаргу камуністых».

**Здавалася, што такая ўласная пастанова абавязвала працаваць, але далей пасяджэньня бюро пастанова не пайшла і ў лютым бюро Нова-Беліцкага райкому КП(б)

Самавыкрыцьцё трацкізму

У другім бэрлінскім лістку «Сьцяг камунізму», які называе сябе органам «арганізацыі марксыстых-ленінцаў» (ГРУП) у нумары ад 9 мая 1930 г. зьмешчаны артыкул Троцкага «Пяцігадовы план і міжнароднае беспрацоўе». Чарговае адкрытае Троцкага ставіць усе пытаньні ад «і». сацыял-фашызм выступае апорным ад усіх «рэвалюцыйных» фраз. Аказваецца, што ў галіне калектывізацыі «сельская гаспадарка вырабіла сусім непрадбачаны скачок».

Толькі пасьмяцьць, могуць забыць установу XV зьезду УсесКП(б): «У сучасны перыяд задача аб'яднаньня і пераўтварэньня дробных індывідуальных сялянскіх гаспадарак у буйныя калектывныя гаспадаркі ў ёсьць». (Стэнограф. справаздача XV партзьезду, стар. 1306). Ленін паказвае на X зьезьдзе партыі, што на сацыялізму трэба рухацца разам з сялянскімі масамі, весьці гэтыя масы «вагал». Гэты ў пачатку навольны рух, нарастаючы прыбяў, пры правільным кіраўніцтве партыі, да гіганцкага паскарэньня тэмпаў, да пераароту ў важнейшых збожжавых раёнах серадняцкіх. Гэтае ўсяго за дзесяцігадзьдзе да калектыўнай гаспадаркі. Гэты пераарот надрыхтаваны усёй папярэдняй палітыкай партыі і ажыцьцяўся на аснове бязьлітаснай барацьбы з хіламі, «левым» і правым, асабліва небясьпечным на даным этапе, на аснове шпаркага тэмпу разьвіцьця сацыялістычнай прамысловасьці, які ж ажыцьцяўляецца, і дзякуючы значнаму росту капіраванасьці насельніцтва, пераходу ад каапэраваньня працесаў зваротку да вытворчага каапэраваньня.

У згодзе са ўсім хорам буржуазнага друку Троцкі лічыць выпрацаўленае перапрацёбку ажыцьцяленьнем. Ліквідатар палічыць — для яго скрыцьцяленьне і ліквідацыя партыі, бо адносіны прадстаўнікоў масамі вёскі ў ходзе сацыялістычнага будаўніцтва мысліцца ім, як адносіны, якія вядуць ня ўхіляе да нарастаньня супярэчнасьцей, як практыкаванне з прычыны гэтага шалу над сераднякамі.

Троцкі — супроць лёзунгу «пяцігодка ў 4 гады» і рэкамэндуе «спыніць дабровольны ў скачках індустрыялізацыі». Ад слабу эканіндустрыялізатарства Троцкі зрабіў пераарот на 180 градусаў — да паступовічны. Ён там просіць і вяршыць: «Палепшаным выдзяленьнем ...будзе прадстаўляць яго мінімальны варыянт». Сацыял - фашысты Троцкі чульліва ня ў адзін голас з правымі апартуністамі. Ён, на вядомым прыкладзе, дзвердзіць гады і хлусіць за двох.

Троцкі прызнаецца, што ў аснове яго пагадзе супроць сусьпільнай калектывізацыі і ўзятага партыяй тэмпу індустрыялізацыі ляжыць барацьба супроць тэорыі пабудовы сацыялізму ў адным краі. «Пяцігадовы план — сьцьвярджае Троцкі — ня можа зьнікнуць суверэнтыцыяй, якія выцякаюць з пагрыбчнага мінулага і сусьветнага становішча. Ён можа, аднак, выкінуць гэтых супярэчнасьцей зьвесьці да мінімуму і крызісных зьяўлішчы часткова зьмякчыць, часткова адхіліць, каб такім чынам ізаляваны рабочай дзяржаве даць перадышку». Троцкі не дазваляе СССР, пралетарскай дыктатуры напраўляць мінулае, лікідаваць клясы і дагнаць і перагнаць капіталістычныя краі. Гэты сацыял - фашысцкі спэцыялісты - гэмэапата рэкамэндуе СССР палавінчатае вырашэньне задачы з раўнаньнем на сусьветны капіталізм. Усе разважаньні Троцкага пабудаваны на процістаўленьні магчымасьцяй пабудовы сацыялізму ў СССР — перамозе сусьветнай рэвалюцыі, у якую ён, аднак, сам ня верыць.

Троцкі рэкамэндуе пабудову генэральнага пляну (ад 10 да 15 год) з разьлікам на шырокае супрацоўніцтва савецкае гаспадаркі з сусьветнай гаспадаркай. Значыцца, 15 год жыцьця сусьветчыць, што беспрацоўе паслабіць антыпрафсаюзаў, якія будуць прымушаны патрабаваць гаспадарчага супрацоўніцтва в СССР. «Адным з важнейшых лёстаць патрабаваньне **гаспадарчага супрацоўніцтва з СССР».** І так, Троцкі заклікае сусьветны пралетарыят даверыцца II-му Інтэрнацыяналу, націскаць на яго і праз яго дабівацца ад ураду гаспадарчага супрацоўніцтва з СССР. Значыцца, асноўнае ў сучасным абстаноўцы распачатага развалу капіталістычнай стабілізацыі — не праблема рэвалюцыі, не задача ізьляяжэньня капіталізму — а сеяньне ілюзій у пралетарыяце адносна магчымасьцяй карэннага паляпшэньня гаспадарчай кан'юнктуры ахопленага крызісам капіталізму.

Блязубая лаянка па адрасе суцэльнай калектывізацыі «на аснове сялянскага інвэнтару» перамешваецца ў Троцкага з парадамі скласьці гаспадарчы плян супрацоўніцтва з капіталістычным сьветам на прадмет індустрыялізацыі СССР і лячэньня беспрацоўя ў капіталістычных краёх. Контр - рэвалюцыйная прапанова Троцкага аб супрацоўніцтве ў пытаньнях гаспадаркі з II-м Інтэрнацыяналам кваліфікуецца ім, «як ужываньне палітыкі адзінага фронту ў такім маштабе, які да гэтага часу ня быў, і ня мог быць ужыты». У гэтым, зразумела, больш страшэннага рэнэгацтва, чым ідыятызму, асабліва, калі супаставіць гэты яго лёзунг са зьдзекамі над лёзунгам «СССР — бацькаўшчына ўсіх працоўных», лёзунгам «вельмі абстрактным» (!!) па думцы Троцкага.

Ня спыняючыся на іншых пэрлях гэтага вартага супрацоўніка фашысцкага друку, можна сказаць, што ён прыпоў цалкам да сацыял - фашызму. Апошнія выказваньні Троцкага аб тэмпах індустрыялізацыі і аб калектывізацыі зазначаюць, што ён нават адмовіўся ад прыкрыцьця сваіх меншавіцкіх ідэй «левымі» фразамі. Аднак, самавыкрыцьцё трацкізму не збаўляе нас ад барацьбы в паўтрацкістымі і левазагібшчыкамі, якія ўпадаюць на практыцы ў трацкізм.

Змагаючыся з правым ухілам—галоўнай небясьпекай для данага пэрыяду, а таксама з прымірэннямі да ўсіх ухілаў, ад лініі партыі, мы павінны паказаць, што «левы» апартунізм, як і правы, пачынаючы з барацьбы супроць кіраўніцтва партыі, у канцы канцоў прыходзіць у лягер рэстаўратараў капіталізму.

Р. А.

У абдымках абвостранага крызісу

Бесьперапынка гільтыны фашысцкіх судоў

«АПТЫМІЗМ НА ГЛІНЯНЫХ НАГАХ»

ВАРШАВА, 8. Прадстаўнікі польскага фашысцкага ўраду ў сваіх выступленьнях вельмі аптымістычна ў ружовых фарбах малююць гаспадарчае становішча Польшчы. Напрыклад, міністар гандлю і прамысловасьці. Кваткоўскі прадракае наступленьне «новага пэрыяду агульнага ажыўленьня прадукцыі гандлю і спажываньня».

Нават у польскім урадавым друку мы знаходзім выступленьні, якія падаюць сапраўднае сьвятло гаспадарчага становішча Польшчы.

Афіцыйны ўрадавы інстытут кан'юнктурных досьледаў сьцьвярджае, што «крызіс будзе прапягвацца вельмі доўгі час», аднак, якога-небудзь паляпшэньня яшчэ няма.

«Дзеньнік Віленскі» (віленская эндэцкая газэта) камэнтуючы выступленьне фашысцкага міністра, называе яго «аптымізмам на гліняных нагах».

ПАГРОЗА І ЖАХ

ВІЛЬНЯ, 7. Гэтымі днямі ў Вільні аддбылася падзея, якая выклікала сапраўдную пагрозу і жах у фашысцкіх колах. Вільня ўжо ня раз бачыла, асабліва за апошні час, шматлікія рабочыя дэманстрацыі пад чырвонымі камуністычнымі штандарамі. Але вось адбылася дэманстрацыя некалькі соцень дзяцей пінэраў. Пінэры прайшлі па некалькіх цэнтральных вуліцах гораду, прадэманстравалі пад сьценамі Лукіскага засьценку, выкідаючы ў дарозе рэвалюцыйныя, камуністычныя лёзунгі.

Паліцыі ўдалося арыштаваць 8 дзяцей. Яны і іх бацькі прыцягваюцца да крымінальнай адказнасьці.

«Абурэньне» ахапіла фашыстых. Віленскае «Слово» «ацэньваючы» дэманстрацыю пінэраў, піша наступнае:

«Камуністычныя арганізацыі сьвяткуюць наміж радам іншых сваіх сьвят таксама і «тыдзень пінэра», які прысьвячаецца палітычнаму ўсьведамленьню дзяцей праз прапаведніканў ідэі камунізму. Гэтая ідэя палітычнага ўсьведамленьня прычыняецца малалому пакаленьню такім чынам, што выпрабаваныя палітычна і крымінальна камсамольцы-апякуны пінэрскай арганізацыі вядуць сваіх наіўных слухачоў да ўрадавых і самаўрадавых аб'ектаў, каб даць выхад свайму энтузіязму, каб выканаць сваё заданьне ў адносінах да Камінтэрну. Агульна вядома, што правадыры за кожную дэманстрацыю атрымліваюць вельмі салідную зарплату ад Камінтэрну. Агітатары ў Вільні ня сьпяць, яны сеюць сваю нясумленную работу сярод самых маладых. Гэта можна было бачыць учора».

Нам зразумелы тыя хлусьлівыя выдумкі фашысцкага друку аб чырвонцах з Масквы і г. д. (І як гэта ня новы!) Зразумела, таксама, чаму яны патрабуюць суровай кары для тых дзяцей, якія трапілі ў рукі дэфэнзывы.

НОВЫЯ ДРАКОНАЎСКІЯ ПРЫСУДЫ

ВІЛЬНЯ, 8. Учора Віленскі акруговы суд прытаварыў Альфонса Бапулевіча і Зьмітра Каранчука за прыналежнасьць да КПЗВ да 6 год катаржнай турмы кожнага. Апрача таго Каранчук прыгавораны яшчэ да 4 год турмы за ніты та карыстаньне падробленымі дакумантамі.

Правакацыйныя выступленьні польскіх пагранічнікаў

Польскія упады ухіляюцца ад вырашэньня пагранічных інцыдэнтаў

У апошні час на беларускім вучастку савецка - польскай мяжы ўчасьціліся выпадкі захопу, раненьня, нават забойства салдатамі польскай пагранічнай варты нашых чырвонаармейцаў - пагранічнікаў.

Яшчэ ў пістападзе 1929 году польскімі пагранічнікамі быў захоплены чырвонаармеец Бурыкін, які ня гледзячы на заявы адпаведнай зьмешанай пагранічнай камісіі аб тым, што ён перайшоў мяжу выпадкова, дагэтуль трымаецца у віленскай турме.

У пачатку красавіка 1930 г. стрэламі з польскага боку быў паранены на вучастку Цімкавіцкага пагранатраду чырвонаармеец—Каламіец.

28 мая на тэрыторыі Польшчы салдатамі польскай пагранічнай варты быў забіты пры таямічных абставінах наш пагранічнік Шчарбакоў.

У ва ўсіх вышэйзначаных выпадках польскія прадстаўнікі сыстематычна адмаўляліся ад сумеснага з савецкімі прадстаўнікамі расьсьледваньня ўсіх абставін гэтых спраў. Справы перададзены ў цэнтр для вырашэньня іх шляхам узьдзейнічаньня ў дыплёматычным парадку на польскі ўрад у мэтах слыненьня недапушчальных учынкаў з боку польскай пагранічнай варты.

ІНДЫЯ—У МОРЫ КРЫВІ

НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ НА СУРОВЫЯ МЕРЫ

СТАМБУЛ. 8. Паводле вестак з Індыі, хваляваньні перакідваюцца з брытанскіх правінцый у тубыльныя дзяржавы, ня гледзячы на тое, што кіраўнікі гэтых дзяржаў прымаюць самыя суровыя меры да спыненьня хваляваньняў. Нацыяналісцкія лідэры падтрымліваюць князёў у іх імкненьні не дапусьціць пашырэньня антыімпэрыялістычнага руху за межы Брытанскай Індыі.

НОВЫЯ ПАТОКІ КРЫВІ

ЛЕНДАН, 8. У гораде Ліпёе ў Індыі паліцэйскія страляілі ў бастуючых чыгуначнікаў і забілі чатырох з іх. (ТАСС).

«ПА ЖАНЧЫНАХ І ДЗЕЦЯХ АГОНЬ

ПАРЫЖ, 8. «Матэн» паведамляе аб растрэле сялянскай дэманстрацыі ў буйным раённым цэнтры Кахінхіны Ду Хоа. Гэта мясцовасьць ужо ядома па сялянскіх хваляваньнях апошніх дзён у акрузе Шалён. У працягу цэлага дня адбываліся дэманстрацыі значнай масы сялян, якія патрабавалі падзелу памешчыцкіх зямель. Дэманстранты на чале з жанчынамі і дзецьмі накіраваліся да будынку, які займаў раённы начальнік. Паліцыя адкрыла агонь і забіла кіраўніцу дэманстрацыі і 6 дэманстрантаў, параніла 20 дэманстрантаў. «Матэн» адначасова сцуха паведамляе аб сутычках паміж паліцыяй і дэманстрантамі ў другім раённым цэнтры акругі, у сяле Бэндлук.

ПАЖАР СЯЛЯНСКІХ ВЫСТУПЛЕНЬНЯЎ

ПАРЫЖ. Нават кароткія афіцыйныя паведамленьні аб масавых сялянскіх выступленьнях на поўдні Індакітаю даюць малюнак вельмі хуткага ахопу раду раёнаў Кахінхіны сялянскім рухам, які разьвіваецца пад лёзунгам патрабаваньняў падзелу памешчыцкіх зямель, канфіскацыі запасаў рысу і адмовы аплаты падаткаў. Сялянскія хваляваньні ў акрузе Шалён ахапілі бадай увесь гэты густа населены раён і ўжо захапляюць суседнюю акругу Танан. Ня гледзячы на расстрэлы і суровыя кары, масавыя арышты і рух надалей расьце і разьвіваецца.

НАГЛАЙ ХЛУСЬНЕЙ І СЬВІНЦОМ

ПАРЫЖ, 8. Губарнатар Кахінхіны ў сувязі з хваляваньнямі апублікаваў адозву да насельніцтва, у якой цьвердзіць, што падаткі цяперашняга году нізкія летаніх. Наколькі гэтая адозва супярэчыць сапраўднасьці можна лёгка бачыць з прамовы сацыяліста Мутэ ў палаце дэпутатаў, дзе ён заявіў аб тым, што **пачынаючы ад 1914 году падаткі ў Індакітаі ўзрасьлі з 40 млн. да 190 млн. піястраў.** Пры гэтым былы губарнатар Індакітаю сацыял-фашысты Варэн у рэпліцы з месца прызнаў, што гэта афіцыйная статыстыка пераменшана. «Гавас» заяўляе, што сялянскім рухам у Кахінхіне кіруюць «прыбыўшыя з іншых месц Індакітаю агітатары». (ТАСС).

Замацаваць дасягненьні агляду,

працягваць барацьбу за паляпшэньне і пашырэньне грамадзкага харчаваньня

Агляд грамадзкага харчаваньня заканчваецца. Зараз падводзяцца вынікі агляду. Яшчэ няма надагуленых матэрыялаў агляду па ЦССР. Але з поўным цвёрдасьцю можна сказаць, што акрамя асобных месцаў особных недахопаў, мы добіліся значнага росту ў гэтай рабоце, мы дасягнулі пералому ў адносінах да справы грамадзкага харчаваньня з боку ураду арганізацый, мы сканцэнтравалі ўвагу пралетарскай грамадзкасьці на пытаньнях барацьбы за паляпшэньне грамадзкага харчаваньня, за падцягненьне гэтага абгалага вучастку і ўзмацненьне

Справа паладжаньня грамадзкага харчаваньня перастае быць габінэтнай справай камэрацыйных арганізацый. Яна робіцца справай усяе грамадзкасьці.

Агляд высунуў ад задач, ад вырашэньня якіх залежыць далейшае разгорнаньне грамадзкага харчаваньня. Таму, ні аб якім паслабленьні барацьбы за паляпшэньне і пашырэньне гэтае галіны ня можа быць гутарка. Справа ідзе аб прадоўжаньні гэтай барацьбы аб замацаваньні вынікаў агляду, аб рэалізацыі тысяч прапаноў рабочых, якія былі ўнесены ў час агляду, аб канкрэтнай рабоце на разгортаньні і ўзмацненьні грамадзкага харчаваньня.

Ісьціна барацьбы за рэалізацыю прапаноў агляду—галавая задача дня. Зусім не выпадкова былі выступленьні радуга таварышоў на апошнім пасяджэньні цэнтральнай агладавай камісіі па гэтым пытаньні. Яны падавалі канкрэтныя факты з практыкі менскага і аршанскага ЦРК, адзначаючы, што апошнія да гэтага часу не правялі ў жыцьцё прапаноў рабочых, якія былі ўнесены ў час агульнага агляду рабочай каапэрацыі. Падобныя ЦРК нават ня маюць матэрыялу гэтага агляду.

Гэтыя факты лішні раз пацьвярджаюць, што справа барацьбы за канкрэтныя рэзультаты агляду—баявая задача, што і гэтую справу трэба ўзяць пад шырокі кантроль рабочых мас.

Асобныя кіраўнікі прафарганізацый яшчэ да гэтага часу не ўсьвядомілі ўсёй важнасьці пытаньня барацьбы за паляпшэньне грамадзкага харчаваньня. Чым калі ня гэтым можна вытлумачыць тое, што на апошнае пасяджэньне цэнтральнай агладавай камісіі, дзе павінны былі разглядацца справаздачы **ЦП саюзу мэталістых, будаўнікоў і мэдсанпрацы** аб іх удзеле ў агляде, не зьявіліся прадстаўнікі зазначаных саюзаў. Па такой недаацэнцы важнейшага пытаньня трэба ўдарыць самым рашучым чынам.

Як вывялася на пасяджэньні цэнтральнай агладавай камісіі яшчэ ня ўсюды праведзены сходы рабочых прадпрыемстваў, на якіх агладавыя камісіі павінны зрабіць справаздачы аб выніках сваёй работы. Ня ўсе прафарганізацыі паклапаціліся аб стварэньні адпаведных умоў для забесьпячэньня максымальнай актыўнасьці гэтых сходаў. Цэнтральная агладавая камісія выпачыла тэрмін падагуленьня вынікаў агляду ў акругах і Менску—20-га чэрвеня. Адсюль тыя ўдарныя тэмпы, якія павінны быць узяты ў гэтай рабоце. На справаздачных сходах агладавых камісіі прадпрыемстваў павінны паказаць рабочым на тыя канкрэтныя вынікі, якія даў агляд ва ўмовах свайго прадпрыемства, раёну і акругі і на тыя перспэктывы, якія вызначаны для разьвіцьця грамадзкага харчаваньня. Тое-ж самае павінна быць зроблена і на сходах рабочых саўгасаў і ў калгасах.

На акруговых канфэрэнцыях павінен быць забясьпечаны шырокі ўдзел актывістых, якія праводзілі агляд непасрэдна на заводах і фабрыках. Цэнтральная агладавая камісія ў сувязі з гэтым пастанавіла, каб для ўдзелу ў рабоце акруговых канфэрэнцый акрамя прадстаўнікоў адпаведных арганізацый і ўстаноў былі прыцягнуты, як мінімум 2-5 рабочых (у залежнасьці ад разьмераў заводу ці фабрыкі), якія прымалі ўдзел у агладзе.

На працягу чэрвеня месяца будуць праводзіцца перавыбары сталовых камісій. Гэтай кампаніі трэба аддаць вялікую ўвагу. Наўкола сталовых камісій, саветаў садзейнічаньня трэба стварыць пастаянны актыў, у першую чаргу з тых рабочых, хто праводзіў агляд. Іх работа павінна зьвесьціся да глыбокага і дэталёвага кантраляваньня ўсёй пастаноўкі работы прадпрыемстваў грамадзкага харчаваньня.

Арганізацыя масавага рабочага кантролю павінна вырашыць і праблему кадраў. Сталовыя камісіі, камісіі садзейнічаньня і іншыя формы грамадзкага кантролю павінны стаць рэзэрвам для вылучэньня на кіраўнічую работу ва ўстановы грамадзкага харчаваньня тысяч рабочых і работніц.

***

Увага да справы грамадзкага харчаваньня ні ў якім разе не павінна быць паслаблена. Трэба замацаваць увагу і актыўнасьць шырокіх мас рабочых, якая дасягнута ў выніку агляду, трэба замацаваць дасягнутыя посьпехі і праводзіць далейшую барацьбу за паляпшэньне грамадзкага харчаваньня.

На гэта павінны зьвярнуць увагу партыйныя, прафсаюзныя і каапэрацыйныя арганізацыі.

Акруговыя і гарадзкія канфэрэнцыі, якія зараз будуць праводзіцца, павінны праходзіць пад дэзунгамі выкананьня вышэйказаных задач.

Р.

„Цені на сонцы“

Паэма А. Александровіча

Выйшла ў сьвет асобным выданьнем вядомая ужо чытацкім масам сатырычная паэма Андрэя АЛЕКСАНДРОВІЧА —«Цені на сонцы».

Як драматург - літаратурная зьява, гэты твор займае сваё віднае месца ня толькі ў творах аўтара, але ва ўсёй беларускай пралетарскай паэзіі.

Трэба адкрыта сказаць, што наша сучасная паэзія (асабліва лірыка) хварэе на анэмію, ня зн. яна пазбаўлена больш-менш глыбокай палітычна-грамадзкай значнасьці і адольнасьцяй мастацкага ўплыву. Вершаў напісана шмат, а вось такіх, якія-б хвалявалі і запамяталіся — вельмі мала. Чаму? —Не таму, зразумела, што нашай рэчаіснасьці нечага прапанаваць паэце, а таму, што напы паэты (большасьці іх) ня могуць, або ня ўмеюць праяжкнуць, як кажуць, слыбей кары рэчаіснасьці. Яны фіксуюць і трактар, і новы завод, і ўдарніцтва, і калгас — усё гэта ня так ужо трудна сустрэць у самым дзяжным вершы. Скажуць: тут уся справа ў таленце. Правільна, але толькі частковa: талент без усьведамленьня перадавых ідэй і імкненьняў часу — ня талент.

Тэму мы маглі-б прыпомніць Уладзімера Маякоўскага. Яго бясспрэчны талент рэалізаваўся толькі тады, калі Маякоўскі абедзьвюма нагамі моцна стаў на глебе сацыялістычнай рэвалюцыі. Талент Маякоўскага данамог яму ажыцьцявіць гэту глебу і адначасова авладаць рэвалюцыяй. Маякоўскі стаў яе агітатарам, адным з вялікіх паэтаў рэвалюцыі.

Тым, што гаварылася вышэй, мы зусім ня выбраемся адмаўляць дасягненьні сучаснай пралетарскай паэзіі. Ім, безумоўна, заўважыць кожны, хто не глядзіць на паэзію з пункту гледжаньня барскага эстэтызму, або з ухвільнай, вечнасьці («мастацтва, якое ўбачыць вякі і народы»). З пункта гледжаньня пралетарыяту, што ажыцьцяўляе ў сваёй дзейнасьці ідэі марксізму, ня можа быць і ня можа быць ніякага «мастацтва, якое ўбачыць вякі і народы».

Эту мелочь
Списать в расход.

«Цені на сонцы» — гэта галерэя тыпаў, якія яшчэ ня сьпісаны ў расход і пакуль што емачна перажоўваюць савецкі пірог. Бясспрэчна, што паэма пішат каму з іх сапсавала апэтыт. Прататыпы паэмы зляваліся... так, як некалі зляваўся вядомы гогалеўскі гарадзнічы Сквазьнік - Дмухановскі, які, «падманіўшы трох губарнатараў», парэпце, напаўся...

Хто яны такія, адкуль прышлі?
...Адзін быў з Меншчыны...
Уцёк на поўдзень ён,
І генэрал барон
Яму даў новы чын,
Даў пару новых шпораў
Цяпер... паголены...

Наш «белы гэрой» умее мімікравацца і
Учора —
Генэрал барона сакратар,
а сёньня — кансультант Саветаў!..
(ст. 13-14).

Фігура ня выдуманая, а, можна сказаць, сьпісана з натуры. А вось
Другі гэрой... няма тае дарогі,
дзе не рассыпаў імкненьні ён свае.

Да рэвалюцыі — ён вызначаў сабе кар'еру архімандрыта. Не ўдалося. Тады далоў расу, і вось («ён бывалы спрытны чалавек»), —
І гляньце — сёньня ён дырэктар не
па жарты.
(ст. 15)

Але ў дырэктара, зразумела, душа архімандрыта, і савецкая ўлада для яго —«ад лукавага». Галерэя варожых цені пэў дапаўняецца тыпамі так сказаць «акадэмічнымі», вось з тых, што доўга калісьці вандравалі на буржуазных стаўніцах, шукаючы ўправы на барбараў бальшавікоў. Частка з іх, як вядома, вярнулася «ў каносу», але ня ўсе з іх чаму-небудзь навучыліся. Менавіта рэч ідзе пра аднаго шаноўнага кума і яго зяця — парнасца.

Наколькі за мяжою іх «не зразумелі» —

Абодва ў нас пяпер
На «бальшавіцкіх «кресах»,
Зьмяніві галыштукі, ды і што
Далей казаць:
Чудоўны кум чырвоны стаў прафэ-
вак», што расьцягваюць нашы працоўныя калейкі, па якія мы «купляем начыньне і цэмэнт».

Праўда, часам паэта ня вытрымлівае бавноса тону і на хвілінку ўпадае ў роспач. Свайго шофэра ён прымушае гаварыць такою небальшавіцкаю мовою:

— Лілі мы кроў, зматаліся,
За што? — І сам ня знае.
— Буржуазію выгналі,
дык новая ўарастае? (ст. 56).

Гэта — толькі рэцэдыў дробна-буржуазнага пэсымізму, што нельга неадзначыць, як памыловае месца ў паэме.

Падагульняючы, мы павінны сказаць, што Андрэй Александровіч у сваёй новай паэме паказвае значны крок наперад у памыбленьні свайго пралетарскага светапогляду і перамаганьні ідэёва - тэхнаваткаў. Яго паэма і з чыста фармальнага боку дае шмат цікавага матар'ялу для дасьледчыка яго творчасьці. Можна сказаць, што Андрэй Александровіч зьяўляецца адным з тых пралетарскіх паэтаў, які жыве ўдарнай тэмай нашага дня, працягваючы ў гэтым сэнсе традыцыі Маякоўскага. Творчасьць Андрэя Александровіча зьяўляецца лепшым адказам тым, хто думае, што актуальная тэма зьнішчае паэзію.

Александровіч у сваёй творчасьці поўны тэй веры і бальшавіцкай бадзёрасьці, якою поўна тая партыя і кляса, да якое ён належыць.

Ён умее зразумець ня толькі кару нашай рэчаіснасьці, але і яе супярэчнасьці, і яе шырэзнныя сацыялістычныя імкненьні. Сваю тэму ён кансьвечаннямі ўдзельнікам вялікага паходу:

Разьлікам паводкі
За пяцігодку
У бой навальнічны
партыя кліча.
Фабрика — полк
Цех — узвод
За крокам крок
— паход! (ст. 75).

Паэма «Цені на сонцы» натхнене ла жорсткай барацьбы в тымі, што прабуюць перашкодзіць пасьпяховаму вялікаму пераходу ад сяльскіх ніцыя, ад ніцыя, ад ніцыя, ад

МАЗЫР ЦЯГНЕЦЦА Ў ХВАСЬЦЕ

ПОЛАЦАК ПАВІНЕН ДАБІЦЦА БАЯВЫХ ТЭМПАЎ СЯЎБЫ ТЭХКУЛЬТУР

Лугавы матылёк—найгоршы вораг нашых палёў.—Неадкладна мабілізаваць грамадзкасьць на барацьбу са шкоднікам!

Бег на месцы

Паводле вестак НКЗ БССР, Мазырская акруга на 5 чэрвеня засеяла 115.981 гэкт., **што складае 81,5 проц. агульнага пляну.** Калгасы выканалі 80,9 проц. свайго заданьня, індывідуальны сэктар—83 проц.

На 1-га чэрвеня Мазыршчына дала 74,3 проц. пляну.

На працягу апошніх пяцідзёвак, як гавораць даныя, Мазырская акруга сыстэматычна адстае ў тэмпах сяўбы ад усіх іншых округ Беларусі. Між тым. Мазыршчына, як самая паўднёвая акруга нашай рэспублікі, начала сяўбу ўжо даўно, самай першай. Бясспрэчна, што Мазырская акруга павінна была па сёньняшні дзень ужо скончыць сяўбу і цалкам выканаць свой пасеўны плян. Мы ня ведаем такіх грунтоўных прычын, якія-б маглі настолькі затрымаць сяўбу ў гэтай акрузе. Мэтэаралёгічныя ўмовы былі на поўначы БССР ня лепшыя, чым на поўдні. Між тым паўночныя акругі ўжо нагналі Мазырскую акругу і хутка яе пераганяюць.

У сьвятле гэтых фактараў сыстэматычнае адставаньне Мазыршчыны зьяўляецца зусім недапушчальным. Гэта сьведчыць аб адсутнасьці кіраўніцтва сяўбой з боку, як раённых, так і акруговых арганізацый. Ужо падыходзіць пара сенакосу, а сяўба ня скончана. Можна сабе ўявіць тыя цяжкасьці, якія пагражаюць уборачнай кампаніі ў гэтай акрузе, у сувязі з затрыманьнем сяўбы.

Прыведзеныя факты гавораць аб неабходнасьці прыняцьця рашучых мер да фарсаваньня скончэньня сяўбы ў Мазырскай акрузе.

Аршанчына выканала 85,7 проц. пляну

ВОРША. Калгасамі Аршанскае акругі на 5-га чэрвеня засеяна 35.069 гэктараў, што складае 80,5 проц. заданага пляну калгасаў. Індывідуальным сэктарам засеяна — 206.021 гэктар або 86,7 проц. пляну. Усяго па акрузе засеяна — 241.890 гэкт., што складае — 85,7 проц. агульнага засеянага пляну.

Пад збожжавыя культуры калгасы засялі — 17.893 гэкт. (85,7 проц. пляну), індывідуальны сэктар — 116.287 гэкт. (84,8 проц.), усяго пад збожжавыя культуры засеяна — 134.180 гэкт. (84,9 проц. пляну).

На тэхнічных культурах плян выкананы ў сярэднім на 72,2 проц. Калгасамі — на 52,3 проц., індыв. сэктарам—на 75,9 проц. Па ільне калгасы выканалі — 57 проц. пляну, індыв. сэктар — 85,6 проц., у сярэднім —80,8 проц. Значна горш стаіць справа з засевам капусты. Тут калгасы далі — 22,8 проц. пляну, індыв. сэктар — 34,8 проц. , у сярэднім — 33,4 проц.

Неабходна дабіцца, каб да паступнай пяцідзёўкі сяўба на ўсёй Мазырскай акрузе ўжо была скончана.

СУСТРЭЦЬ ШКОДНІКА УЗБРОЕНЫМІ

У Вабруйскай і Гомельскай округах зьявіўся лугавы матылёк — аб гэтым коратка паведамляюць нашы карэспанденты. Аб магчымасьці яго зьяўленьня гаварылі ўжо даўно і добра ведалі ў Наркамземе БССР. Ляя 2 тыдняў таму чазад «Зьвязда» папярэджвала, што ў нас не выдецца ніякай падрыхтоўкі да барацьбы з лугавым матылькам, зьяўленьне якога чакалася. Мы пісалі, што ў Наркамземе БССР няма нават спэцыялістага, які-б кіраваў арганізацыяй барацьбы і падрыхтоўкай адпаведных арганізацый.

Лугавы матылёк—адзін з самых небясьпечных ворагаў сельскай гаспадаркі. Гэты шкоднік, калі загадзя ня прыняць рашучых мер да барацьбы з ім, наносіць сельскай гаспадарцы вялізарную шкоду. Зусім зразумела, што барацьба з лугавым матылькам можа даць добрыя вынікі толькі ў тым выпадку, калі яна адпаведна арганізавана, праводзіцца адначасова ўсімі сельска-гаспадарчымі арганізацыямі, усімі сэктарамі, па адзіных, выпрацаваных у адпаведнасьці з умовамі БССР, мэтадах. Гэтага ня было зроблена ў нас. Кожная ўстанова меркавала змагацца са шкоднікам па-свойму, а некаторыя з сельска-гаспадарчых арганізацый, наогул ніякай падрыхтоўкі не вялі. З другога боку, асобныя арганізацыі не маглі паставіць падрыхтоўку на належную вышыню, ня маючы ніякіх установак, ніякага кіраўніцтва з боку Наркамзему БССР.

Трэба, такім чынам, адкрыта канстатаваць: **мы сустракаем найгоршага шкодніка непадрыхтаванымі.** Праўда, станцыя аховы расьлін праводзіць вялікую работу, але яна ня носіць і ня можа насіць апэрацыйнага характару. Апошняе—справа Наркамзему.

Учора наш супрацоўнік зьвярнуўся ў Наркамзем з запытаньнем, як арганізавана барацьба са шкоднікам. На гэта ён атрымаў адказ, які сьцьвярджае нашасьці БССР да барацьбы з лугавым матылькам. Нам. Наркамзему адказаў: «Наркамзем БССР даў тэлеграфную дырэктыву акругам аб арганізацыі барацьбы з лугавым матылькам, паводле існуючых інструкцый»...

Кожнаму зразумела, што тэлеграма Наркамзему і «існуючыя інструкцыі» значна справу не насунуць наперад. Ранейшы асноўны недахоп—адсутнасьць сыстэматычнага кіраўніцтва з боку НКЗ, адзінага пляну барацьбы—фактычна не ліквідаваны і па сёньняшні дзень.

Вялізарную ролю ў барацьбе са шкоднікам заклікана адыграць вясковая грамадзкасьць. Між тым, не ўвага зусім не мабілізавана вакол пытаньняў барацьбы з лугавым матылькам. Асоавіяхім, які павінен быў у дацым выпадку зьявіцца актыўнейшым удзельнікам барацьбы, пакуль што ня можа не разгортвае сваю работу.

Аказваецца, што да гэтага часу, нават, ня выдадзены папуляры плякат на тэму аб лугавым матыльку.

Становішча, якое стварылася патрабуе тэрміновага прыняцьця рашучых мер і мабілізацыі ўсіх сіл і сродкаў. Ні ў якім выпадку ня можа быць дапушчана, каб шкоднік захапіў больш-менш вялікую тэрыторыю пасеваў і зьнішаў эфэкт сёлетняй бальшавіцкай сяўбы. Справа барацьбы з лугавым матылькам патрабуе ўдзелу ня толькі агранамаў, але самых шырокіх мас калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў-індывідуальнікаў.

Мясцовыя партыйныя і савецкія арганізацыі ў тых округах і раёнах, дзе ўжо зьявіўся лугавы матылёк і дзе ён маючыхся даных ён можа зьявіцца, павінны мабілізаваць на барацьбу з гэтым шкоднікам усю грамадзкасьць, масы калгасьнікаў і індывідуальнікаў.

Барацьба з лугавым матылькам можа даць і дасьць пасьпяховым вынікі толькі ў тым выпадку, калі ў цэнтры будзе створана адпаведнае кіраўніцтва гэтай справай. Мы лічым карысным ажыцьцяўленьне наступных мерапрыемстваў:

1. Стварыць пры НКЗ БССР штаб барацьбы з лугавым матылькам. У яго склад павінны ўвайсьці як прадстаўнікі навуковых, сельска-гаспадарчых, так і грамадзкіх арганізацый.

2. Штаб павінен кіраваць падрыхтоўкай і арганізацыяй барацьбы са шкоднікам, выпрацаваць адпаведныя метады барацьбы, якія абавязаны ажыцьцявіць усе сыстэмы і сэктары.

3. Асоавіяхім павінен прыняць самы актыўны ўдзел у барацьбе з лугавым матылькам, мабілізаваўшы на ўсіх акругах адпаведную колькасьць сваіх членаў на правядзеньне гэтай справы.

Аб чым гаворыць зрыў аднэй нарады

Учора, а 2-я гадзіне, у памяшканьні НКЗ, было назначана пасяджэньне камісіі па сіласаваньні. Ня гледзячы на своячасовае паведамленьне ЦК ЛКСМБ, Жывёлаводсаюзу, Паляводсаюзу і іншых устаноў, на нараду зьявіліся толькі прадстаўнікі Белкалгасцэнтру, «Чырвонай Зьмены» і «Зьвязды», а рэшта прадстаўнікоў не зьявілася. Нарада сарвалася. **Гэта яшчэ раз падкрэсьлівае правільнасьць ацэнкі «Зьвязды», што да заданьня НКЗ СССР па сіласаваньні няма належнай увагі,** а ў палуначасьні—ігнараваньне задач сіласаваньня.

Ляўковіч.

Полацак яшчэ ня даў рашучага пералому

Рэдакцыя ўчора атрымала ад Полацкага акрэа тэлеграму - маланку, у якой паведамляецца, што на 5-га ліпеня калгасы выканалі пасеўны плян па ільне на 43,3 проц., індывідуальнікі — на 37 проц., па каноплях — калгасы на 54.1 проц., індывідуальнікі — на 51,4 проц.

Ня гледзячы на нашу просьбу даць весткі аб агульным выкананьні округай пляну як на ільне, так і па каноплях, акрэа патрабуе весткі ня прыслаў. Прымаючы, аднак, пад увагу суадносіны паміж сэктарамі ў Полацкай акрузе можна меркаваць, што акрута ў цэлым выканала плян: **па ільне, прыблізна, на 38-39 проц.; па каноплях, прыблізна, на 52 проц.**

На 1-га ліпеня плян быў выкананы па ільне: калгасамі — на 22,1 проц., індывідуальнікамі — 24,2 проц.

Такім чынам апошняя пяцідзёўка, хаця і дала амаль падвазьнае засеянай плошчы, аднак, не дала рашаючага пералому ў сяўбе тэхнічных культур па Полацкай акрузе. На ільне выкапана прыблізна толькі 40 проц. пляну ў той час, як сяўба паогул ужо канчаецца. Некалькі лепш з канопляміі, па якіх плян выканаў некалькі больш, чым на 50 проц., але і ў адносінах гэтай культуры рашаючага пералому таксама не дасягнута. Прыведзеныя даныя сьведчаць аб тым, што полацкія арганізацыі павінны яшчэ больш узмацніць работу і дабіцца сапраўды баявых тэмпаў сяўбы тэхкультур.

103,3 ПРОЦ. ПЛЯНУ

СЬМІЛАВІЧЫ, Менскай акр.

Сьмілавіцкі раён выканаў плян веснавой сяўбы на 103,3 проц. Яравы клін раёну пашыраны на 3.077 гэкт. за рахунак распарчоваж, мэліяраваных зямель і пустуючага папару. Зарганізавана 18 новых калгасаў. Узмоцнены і пашыраны існаваўшыя 16 калгасаў. У часе веснавой кампаніі арганізован новы саўгас на плошчы 730 гэкт. Старыя саўгасы пашырылі свой яравы клін з 2.597 гэкт. да 3.600 гэкт.

Дырэктыва аб збожжаачыстцы выканана на 97,5 проц.

Калі будзе выданы плякат аб барацьбе з лугавым матылькам?

Ужо месяц таму назад, ня болей фае выдавецтва ўзяло на сябе выданьне спэцыяльнага масавага плякату аб барацьбе з лугавым матылькам. Беднаяводсаюз згадзіўся купіць для сваёй сеткі прыблізна 30.000 штук плякатаў, пры тэй умове, калі яны будуць выпушчаны своячасова, г. зн. 2-3 тыдні таму назад. Ня раз увага Белдзяржвыдавецтва зварочвалася на неабходнасьць тэрміновага выпуску плякату, бо пагроза зьяўленьня лугавога матылька была відавочна больш месяца таму назад. Выдавецтва абяцала на працягу аднаго тыдня выдаць гэты плякат.

Ад гэтага часу ўжо прайшоў амаль цэлы месяц. На палёх ужо зьявіўся лугавы матылёк. Масавага-ж папулярнага плякату Белдзяржвыдавецтва і ня выдала.

С-кі.

РАБОЧЫЯ і КАЛГАСЬНІКІ XIII-му ЗЬЕЗДУ КП(б)Б

АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ПЕРАТВАРАЮЦЦА Ў ЖЫЦЬЦЁ

Ударная брыгада Менскага хлебазаводу павялічыла выпуск прадукцыі на 15 проц.

Асьветнікі Пралетарскага раёну (Гомель) ліквідуюць няпісьменнасьць сярод 2.000 сэзоньнікаў.

Ватаршчыцы фабрыкі „Дзьвіна" пачалі выконваць узятыя на сябе абавязкі.

Сьвідравальнік заводу «Энэргія», т. ЗУЕЎСКІ. Падаў заяву аб прыёме ў партыю.

Ватаршчыцы перавыканалі прамфінплян

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). У газэце «Зьвязда» ад 7-га чэрвеня паведамлялася, што рабочыя фабрыкі «Дзьвіна» ўзялі на сябе рад канкрэтных і выразных абавязацельстваў у мэтах перавыкананьня прамфінпляну да XVI партзьезду. Работніцы ватаркага цэху абвясьцілі сябе ўдарніцамі імя XIII зьезду КП(б)Б і абавязаліся зусім зьнішчыць прагулы і перавыканаць прамфінплян. Даныя за апошнія дні гавораць аб тым, што ватаршчыцы выконваюць узятыя на сябе абавязкі. ПРАМФІНПЛЯН ЗА 3-га ЧЭРВЕНЯ ПЕРАВЫКАНАНЫ НА 0,05 ПРОЦ.

40 РАБОЧЫХ ПАДАЛІ ЗАЯВУ АБ УСТУПЛЕНЬНІ Ў ПАРТЫЮ, 12 РАБОЧЫХ—У КАМСАМОЛ.

Жадаюць уступіць у партыю—работніца часальнага аддзяленьня т. МІЛЕШКА, якая мае стаж 23 гады, ударніца т. ДЗЬМІТРЫЧЭНКА—член прэзыдыуму гарсавету, фабкому і вытворчай камісіі.

Цэх за цэхам абвяшчае сябе ўдарным і разгортвае сацыялістычнае спаборніцтва па якасных і кольвасных паказальніках.

Іваноўскі.

Узнагародзіць тав. Сталіна ордэнам Леніна

Рабочыя Менскага хлебазаводу зьвярнуліся з рапартам да XIII-га зьезду КП(б)Б, у якім адзначаецца, што завод за мінулы год даў рад дасягненьняў у адносінах выкананьня паказальнікаў прамфінпляну. Выраб прадукцыі павялічыўся на 18 проц.; накладныя выдаткі зьніжаны на 13,78 проц.; дзякуючы рацыяналізацыі зэканомлена —11.000 руб. Зараз на заводзе арганізавалася ўдарная брыгада імя XIII-га зьезду, якая дабілася павялічэньня выпуску прадукцыі на 15 проц.

Рабочыя хлебазаводу пастанавілі хадайнічаць перад ЦБК СССР аб узнагародзе правадыра рабочае клясы, кіраўніка Пенінскай партыі тав. Сталіна ордэнам Леніна.

Гэктары імя XVI партзьезду

ПОЛАЦАК. (Наш. кар.). Вульскі райком КП(б)Б [illegible] пікаў для распрацоўкі за ўсіх ячэйках і калгасах тэзіс [illegible]

Раённы агульны сход рабселькораў пастанавіў [illegible] заараць кавалак зямлі імя XIII-га зьезду КП(б)Б і XVI-га [illegible]

Калгас «Зьвязда» зараў 8 гэкт. ільну імя XIII [illegible] гас «Асьвета»—3 гэктары імя XVI-га Ўсесаюзнага пар[illegible] партыйная і камсамольская ячэйкі—3 гэкт. ільну імя X[illegible] партыі.

[illegible] 32 работ[illegible] XVI-га партзьезду. [illegible] сельсавеце [illegible] зьезду. [illegible] зьезду. Калгас: Мошнаўская [illegible] XVI-га зьезду [illegible]

АНАРЭНКА.

Калгас імя „1-га мая"—ў падарунак партзьезду

Калгас імя «1-га мая» ў Слуцкім раёне паведамляе [illegible] XIII-му зьезду КП(б)Б, што плян веснавой сяўбы ім выкапан на 100 проц. У падарунак зьезду калгас узараў 60 гэкт. залежаў, каб увосень [illegible] засеяць жытам. 1 гэкт. ішаніцы калгасьнікі адлічваюць на [illegible] пабудовы трактарнай калёны імя XIII зьезду КП(б)Б і выклікаюць [illegible] на іх прыкладзе ўсе іншыя калгасы Бабруйшчыны.

Па даручэньні агульнага сходу ў складзе 411 асоб.

старшыня калгасу—С. ПАШТЭЙН.

Замест 30 дзён —у 25

БАРЫСАЎ. (Наш. кар.). **Па прадпрыемствах гораду ідзе шырокая падрыхтоўка да XVI-га зьезду партыі. НА ГУЦЕ ІМЯ ДОМБАЛЯ АРГАНІЗАВАЛАСЯ ЎДАРНАЯ БРЫГАДА ІМЯ ПАРТЗЬЕЗДАЎ, ЯКАЯ ПАСТАВІЛА САБЕ МЭТАЙ ДА ТЭРМІНУ СКОНЧЫЦЬ РАМОНТ ЗАВОДУ, ЗАМЕСТ 30 ДЗЁН—у 25. (Завод спыняецца на рамонт 15-га чэрвеня).**

Сход рабкораў пастанавіў выпусьціць спэцыяльны нумар газэты «Гута», прысьвечаны пытаньням Усесаюзнага [illegible] зьезду і палялізаваньня вытворчасьці.

Арганізавалася брыгада імя партзьезду У ЛІЦЕЙНЫМ ЦЭХУ ЗАВОДУ «ПРАЛЕТАРСКІ МОЛАТ». Брыгада абавязалася перавыканаць прамфінплян, ліквідаваць прагулы, павысіць якасьць прадукцыі і перакваліфікаваць у ліцейшчыкі 4 чорнарабочых.

Гэтакая-ж брыгада арганізавана ў ЗОЛЬНЫМ ЦЭХУ ГАРБАРНІ ГАРКАМБІНАТУ. У бліжэйшым часе пачнецца праверка выкананьня заключаных дагавораў аб сацспаборніцтве. Бюро парткалектыву гарбарні арганізуе групу рабочых-кандыдатаў партыі і беспартыйных для падрыхтоўкі іх да паступленьня ў партыю.

Старыя рабочыя ідуць у партыю

Хваля сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў сувязі з падрыхтоўкай да XVI партзьезду ахапіла панчошную фабрыку. 21 рабочы фарбавальна - апаратурнага цэху абвясьцілі сябе ўдарнымі імя XVI партзьезду.

ЗА АПОШНІЯ ДВА ДНІ ПАДПІСКА НА ГАЗЭТЫ «ПРАВДА» І «ЗЬВЯЗДА» ПАВЯЛІЧЫЛАСЯ НА 23 ЭКЗЭМПЛЯРЫ.

17 рабочых з вытворчым стажам звыш 10 год падалі заявы аб жаданьні ўступіць у партыю.

4-га чэрвеня панчошніцы пачалі прапрацоўку тэзісаў.

Абавязацельствы асьветнікаў

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Асьветнікі Пралетарскага імя Сталіна раёну, гор. Гомель, паслалі рапарт XIII зьезду КП(б)Б з паведамленьнем аб тым, што яны ўзялі на сябе абавязак ліквідаваць агульную і літэрную няпісьменнасьць сярод 2тыс. сэзоньнікаў і павесьці барацьбу за паскарэньне тэмпаў усеагульнага навучаньня.

ПЕРАХОДЗЯЦЬ НА ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНУ

КЛІМАВІЧЫ, Магілеўскай акр.

Агульны сход Радзіцкай партыйнай ячэйкі [illegible] калгасьнікаў [illegible] вёў:

Да дня адкрыцьця XVI-га зьезду УсесКП(б) перавесьці мясцовых калгасьнікаў на зьдзельную сыстэму аплаты працы.

Да гэтага-ж тэрміну канчаткова падрыхтаваць увесь інвэнтар да ўборачнай кампаніі.

Неадкладна арганізаваць дзьве ўдарныя брыгады касцоў і жанцоў імя XIII і XVI зьезду партыі.

С. Ш.

ВІТАЛЕЎ—стары рабочы-сьлесар, першы ўдарнік заводу «Чырвоны Металіст». Вытворчы стаж 18 год. Уступіў у рады КП(б)Б.

На ўдарнаму зьнішчым нашы зімовыя недахопы

Пэрыяд зімовага навучаньня Аб'яднанай Беларускай Вайсковай школы скончыўся. Дзякуючы напружанням тэмпам і ўдарніцтву ліквідавана цэлы рад недахопаў у баявой падрыхтоўцы.

Трэба сказаць, што поўнасьцю АБВШ задач, якія былі высунуты на зімовы пэрыяд, ня здолела выканаць. Есьць цэлы рад недахопаў. У галіне стралковай справы выпрацаньне стралковых задач праводзіць ня зусім выразна і дасканала. Вугамар тэарытычна ведаюць добра, але практычна карыстацца ім ня зусім добра могуць. Адсутнічае рухомасьць, няма належнай хуткасьці ў выпрацэньні задач. Есьць пімат яшчэ і іншых недахопаў.

Лета павінна ўсе гэтыя недахопы зьнішчыць. Лета павінна даць поўную ўвязку тактычнай і стралковай падрыхтоўкі. Курсанты павінны добра навучыцца ядладжанасьці бою сумесна з артылерыяй і іншымі спэцыяльнасьцямі войск, як: салёрнымі, сувязь, інжынэрнымі, бронячасьці і танкі. І самае галоўнае для нас, кулямётчыкаў, гэта практычна кіраваць вугамарам, умець кіраваць цэлай батарэяй. Навучыцца зэлігерны пэрыяд страляць з-за заслонены пазыцый і па закрытых цэлях.

Трэба яшчэ навучыцца ўжываць алтычныя прылады, стралковыя і кулямётныя для азначэньня дыстанцыі. Правядзеньне поўнасьцю новага курсу страляньня. Асабліва зьвярнуць увагу на абыходжаньне са зброяй. Да поўнае выкананьне загаду Рэвваенсавету Саюзу ў адносінах аховы зброі. Выпрацаваць хуткасьць, спрыт, мабільнасьць. Павысіць трэніроўку страляньня ў цёры, на палявым гарадку. Усё вышэйпаказанае можна выканаць толькі тады, калі мы будзем працаваць ударна, шляхам ужываньня мэтаду сацспаборніцтва, шырокага разгортваньня самакрытыкі.

Партыйная і камсамольская арганізацыі, ваенкоры ўсю ўвагу згуртуюць на гэтых пытаньнях. Па-бальшавіцку, па-ўдарнаму выканаем баявы «прамфінплян» тактычна - стралковай і палітычнай падрыхтоўкі школы.

Я. ВАЙТОВІЧ.

РАЗГАРНУЦЬ ПАДРЫХТОЎКУ ДА УБОРАЧНАЙ і АСЕНЬНЯЙ ПАСЕЎКАМПАНІІ

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Улічваючы вялікае значэньне ўборачнай і асеньняй кампаніі для далейшага разьвіцьця ўсёй народнай гаспадаркі БССР, сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і вырашэньня з гэтым праблемы забесьпячэньня рабочых мас прадуктамі харчаваньня, СНК БССР адзначае, што асноўнымі задачамі ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі зьяўляюцца:

а) усямернае замацаваньне дасягнутых посьпехаў у калектывізацыі сельскае гаспадаркі праз практычную арганізацыйную работу на ўнутраным будаўніцтве калгасаў, рацыянальную арганізацыю ў іх працы, увядзеньне перадавой гаспадарчай тэхнікі і ўстанаўленьне правільных узаемаадносін унутры калгасаў і ўцягненьнем у гаспадарчае кіраўніцтва найбольш адданых калгаснаму руху і спрактыкаванных у сельскай гаспадарцы працаўнікоў;

б) далейшае разьвіцьцё калектывізацыі на падставе поўнай дабраволнасьці праз шырока разгорнутую арганізацыйную і растлумачальную работу серод бядняцка - серадняцкіх мас вёскі;

в) арганізацыя простых вытворчых кааперацыйных аб'яднаньняў (спэцыялізаваных вытворча - збытавых таварыствы) і далейшае каапераваньне бядняцка - серадняцкіх гаспадарак з упяцьненьнем у вытворчыя кааперацыйныя аб'яднаньні тых сялянскіх двароў, якія яшчэ не ўвайшлі ў калгасы;

г) павялічэньне саўгаснага будаўніцтва і ўзмацненьне рэарганізаваных і спэцыялізаваных савецкіх гаспадарак;

д) павышэньне ўраджайнасьці і таварнай сельска - гаспадарчай прадукцыі ў калектыўным і ў індывідуальным сэктары сельскае гаспадаркі, а адначасовым палепшэньнем якасьці і зніжэньнем сабекошту сельска - гаспадарчай прадукцыі.

Вядучы пад увагу пералічаныя вышэйпаказаныя задачы асеньняй пасеўнай кампаніі, СНК БССР пастанаўляе:

1. Пашырэньне пасеўнай плошчы пад асноўнымі культурамі вызначыць у [illegible] гэкт. з засевам у 1930 г. 1.418 [illegible] гэкт. у параўнаньні з 1.363 тыс. гэкт. у мінулым годзе, з якіх 10,2 тыс. гэкт. у савецкіх гаспадарках, адначасова забесьпечыўшы павышэньне ўраджайнасьці на 6-8 проц. у параўнаньні з мінулым годам, для чаго зацьвердзіць паступны комплекс мерапрыемстваў пры правядзеньні асеньняй пасеўнай кампаніі;

а) засеяць азімымі на палепшаным ворыве плошчу 750 тыс. гэкт., з якіх у савецкіх гаспадарках — 10 тыс. гэкт. і калгасах — 100 тыс. гэкт.;

б) [illegible] насеньнем для чаго поўнасьцю скарыстаць мясцовыя гатункавыя насенныя фонды савецкіх гаспадарак і калгасаў і завезьці ў БССР 4.600 тон азімага жыта і 200 тон азімай ішаніцы з іншых раёнаў Саюзу, аб чым Народны Камісарыят Зямляробства і Народны Камісарыят Гандлю павінны падняць пытаньне перад адпаведнымі саюзнымі органамі;

в) ачысьціць насеньне ў савецкіх гаспадарках і калгасах на 100 проц. і ў індывідуальных гаспадарках ня менш як на 90 проц., прычым ня менш 40 проц. насеньня павінна быць пропушчана праз трыеры ў індывідуальным сэктары і ўсе 100 проц. у савецкіх гаспадарках і калгасах;

г) пратруціць насеньне азімай пшаніцы на 100 проц. ад агульнай колькасьці засеву ва ўсіх сэктарах;

д) правесьці радавы засеў на плошчы 100 тыс. гэкт., у тым ліку ў калгасах 70 тыс. гэкт., у савецкіх гаспадарках 10 тыс. гэкт. і ў вытворчых кааперацыйных аб'яднаньнях — 20 тыс. гэкт., пры дапамозе савецкіх гаспадарак і калгасаў машынамі;

е) выканаць яблевую заворку на плошчы ня менш 50 проц. ад яравога кліну і пажнівнае лушчэньне на плошчы 45 тыс. гэкт. у калгасах і 10 тыс. гэкт. у савецкіх гаспадарках, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на падъём з восені цалінных зямель, за кошт якіх памяншаецца пашыраньне яравой пасеўнай плошчы ў 1931 годзе;

ж) завапнаваць глебу паводле гадавога пляну на плошчы 75 тыс. гэкт., у тым ліку ў савецкіх гаспадарках — 5 тыс. гэкт., у калгасах — 57 тыс. гэкт. і ў індывідуальных гаспадарках — 10 тыс. гэкт., забясьпечыўшы выкананьне гэтага заданьня бесьперабойнай загатоўкай вапны і рацыяналізацыю ўжываньня яе, а таксама шырока растлумачыць агранамічныя мерапрыемствы сярод шырокіх мас працоўнага сялянства;

з) забясьпечыць выкананьне поўнасьцю гадавога пляну тарфаваньняў на плошчы 40 тыс. гэкт. і абор попелу на ўгнаеньне ў колькасьці 33 тыс. тон, захаваўшы сабраны попел у асеньнюю пасеўную кампанію да вясны 1931 году пад яравыя культуры;

і) прапанаваць Народнаму Камісарыяту Зямляробства даць паказаньні мясцовым зямельным органам аб дармовым выдзяленьні, дзе гэта патрэбна і магчыма, на адзін сезон выгнаў з вольных дзяржаўных зямель для калгасаў і зямельных аб'яднаньняў, якія робяць раньні ўздым папару.

2. Для своячасовага выкананьня сельска - гаспадарчых работ у пэрыяд уборачнай і пасеўнай кампаніі прапанаваць Белсельгасабу [illegible] для чаго поўнасьцю скарыстаць мясцовыя гатункавыя насенныя фонды савецкіх гаспадарак і калгасаў і завезьці ў БССР 4.600 тон азімага жыта і 200 тон азімай ішаніцы з іншых раёнаў Саюзу, аб чым Народны Камісарыят Зямляробства і Народны Камісарыят Гандлю павінны падняць пытаньне перад адпаведнымі саюзнымі органамі;

в) ачысьціць насеньне ў савецкіх гаспадарках і калгасах на 100 проц. і ў індывідуальных гаспадарках ня менш як на 90 проц., прычым ня менш 40 проц. насеньня павінна быць пропушчана праз трыеры ў індывідуальным сэктары і ўсе 100 проц. у савецкіх гаспадарках і калгасах;

г) пратруціць насеньне азімай пшаніцы на 100 проц. ад агульнай колькасьці засеву ва ўсіх сэктарах;

д) правесьці радавы засеў на плошчы 100 тыс. гэкт., у тым ліку ў калгасах 70 тыс. гэкт., у савецкіх гаспадарках 10 тыс. гэкт. і ў вытворчых кааперацыйных аб'яднаньнях — 20 тыс. гэкт., пры дапамозе савецкіх гаспадарак і калгасаў машынамі;

е) выканаць яблевую заворку на плошчы ня менш 50 проц. ад яравога кліну і пажнівнае лушчэньне на плошчы 45 тыс. гэкт. у калгасах і 10 тыс. гэкт. у савецкіх гаспадарках, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на падъём з восені цалінных зямель, за кошт якіх памяншаецца пашыраньне яравой пасеўнай плошчы ў 1931 годзе;

ж) завапнаваць глебу паводле гадавога пляну на плошчы 75 тыс. гэкт., у тым ліку ў савецкіх гаспадарках — 5 тыс. гэкт., у калгасах — 57 тыс. гэкт. і ў індывідуальных гаспадарках — 10 тыс. гэкт., забясьпечыўшы выкананьне гэтага заданьня бесьперабойнай загатоўкай вапны і рацыяналізацыю ўжываньня яе, а таксама шырока растлумачыць агранамічныя мерапрыемствы сярод шырокіх мас працоўнага сялянства;

з) забясьпечыць выкананьне поўнасьцю гадавога пляну тарфаваньняў на плошчы 40 тыс. гэкт. і абор попелу на ўгнаеньне ў колькасьці 33 тыс. тон, захаваўшы сабраны попел у асеньнюю пасеўную кампанію да вясны 1931 году пад яравыя культуры;

і) прапанаваць Народнаму Камісарыяту Зямляробства даць паказаньні мясцовым зямельным органам аб дармовым выдзяленьні, дзе гэта патрэбна і магчыма, на адзін сезон выгнаў з вольных дзяржаўных зямель для калгасаў і зямельных аб'яднаньняў, якія робяць раньні ўздым папару.

2. Для своячасовага выкананьня сельска - гаспадарчых работ у пэрыяд уборачнай і пасеўнай кампаніі прапанаваць Белсельгасабу [illegible] нальнага скарыстаньня трактараў, прадугледзеўшы забесьпячэньне іх запаснымі часткамі, рамонтам, гаручым і змазачным матар'ялам, а таксама падборам належных кадраў.

3. Улічваючы тое, што машына-конныя станцыі ва ўмовах БССР маюць вялікае значэньне для поўнага скарыстаньня сельска - гаспадарчага інвэнтару ў савецкіх гаспадарках і калгасах даручыць калгасна - кааперацыйнай сыстэме і саўгастрэстам арганізаваць машына - конныя станцыі, бируючы кірунак ня толькі на абслугоўваньне савецкіх гаспадарак і калгасаў, але і вакольных бядняцка - серадняцкіх гаспадарак па дагаворы.

Даручыць Народнаму Камісарыяту Зямляробства і Белкалгасцэнтру прапрацаваць палажэньне аб машына-конных станцыях і не пазьней, як праз два тыдні падаць на зацьвярджэньне Эканамічнай Нарадзе.

4. Даручыць Народнаму Камісарыяту Зямляробства зьвярнуцца да Трактарацэнтру з хадайніцтвам аб арганізацыі ім да ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі ўсіх намечаных у БССР пляном 1929-30 году машына - трактарных станцый.

5. Для забясьпечаньня конскаю цягаю сілаю калгасаў, галоўным чынам, арганізаваных з батрацкіх і бяскопных местачковых гаспадарак, прапанаваць Белмалжывёлсаюзу закупіць на сродкі, якія ўжо ёсьць на гэту мэту коняй і перадаць іх калгасам да пачатку ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі.

6. Прапанаваць кааперацыйным арганізацыям і Белкалгасцэнтру арганізаваць не пазьней 15 чэрвеня ўкараненьня і малацільныя брыгады для забясьпячэньня поўнага скарыстаньня машын з тым, каб пасьля выкананьня работ у калгасах брыгады дапамагалі зьбіраць ураджай бядняцка - серадняцкім гаспадаркам.

7. Паставіць перад сельска - гаспадарчымі трустамі і Белкалгасцэнтрам задачу арганізаваць у пэрыяд уборачнай і пасеўнай кампаніі шырокую дапамогу бядняцкім гаспадаркам праз даючу ім машын, цягавай сілы і насеньня.

Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Зямляробства склясьці канкрэтны плян дапамогі бядняцкім гаспадаркам ва ўборачнай і пасеўнай кампаніі; адначасова ўжыць захады да шырокага прыцягненьня саміх сялянскіх мас да вытворчай дапамогі беднаце праз ажыцьцяўленьне і ўзмацненьне дзейнасьці камітэтаў сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі.

8. Прапанаваць Белсельгасабу своячасова прывезьці сельска - гаспадарчыя машыны і прылады да асеньняй [illegible] ных машын 25 чэрвеня, а для іншых машын — 1 жніўня.

9. Прапанаваць Белкалгасцэнтру, Белсельтрасту, ЦК Сялянскіх Таварыстваў узаемнай дапамогі неадкладна распачаць рамонт уборачных машын з тым, каб поўны рамонт уборачных машын скончыць да 1 ліпеня, для чаго прапанаваць Белсельгасабу забясьпечыць майстэрні матэлам, абсталяваньнем і запаснымі часткамі.

10. Прапанаваць Белкалгасцэнтру своячасова арганізаваць у калгасах насенныя фонды для поўнага забясьпячэньня засеву калгаснага азімага кліну ачышчаным і адсартаваным насеньнем.

Цэнтральны Камітэт сялянскіх таварыстваў узаемнай дапамогі павінен ужыць усе магчымыя захады для забясьпячэньня азімым насеньнем бядняцкіх гаспадарак, якія не ўвайшлі ў калгасы.

11. Зьвярнуць увагу акруговых выканаўчых камітэтаў Гандлю, Белнаяводсаюзу і акругі ўзмацненьня мерапрыемстваў для выпрацэньня кармовага пытаньня, у адасобку для ўкараненьня ў практыку сельскай гаспадаркі сіласаваньня кармоў, падрыхтоўкі ільнуны для сілосных культур будучага году, а таксама палепшэньня лугоў і пашаў.

12. Агульны абъём мерапрыемстваў па сіласаваньні вызначыць у 1 млн. тон сілсаваных кармоў. Калі ня будзе атрымана ад Народнага Камісарыяту Зямляробства СССР патрэбная колькасьць сіласных вежаў, дык Народны Камісарыят Зямляробства БССР павінен падрыхтаваць да замены вежаў сіласнымі (ямамі і траншэямі).

13. Паверхневае і каранне палепшэньне сенажацяй зрабіць на плошчы, прадугледжанай гадавым планам Народнага Камісарыяту Зямляробства ў 287 тыс. гэкт. паверхневага і 40 тыс. гэкт. каранпага.

14. У галіне садоўніцтва пасадзіць новых садоў прамысловага значэньня на плошчы 4 тыс. гэкт., у тым ліку 500 гэ

Мяса-загатоўкі патрабуюць увагі грамадзкасьці

Грамадзкасьці ў забесьпячэньні рабочых мясцовымі мясапрадуктамі патрабуюць да сябе ўвагі ўсёй нашай грамадзкасьці. Асабліва выраслая работа патрабуецца ад мясазагатоўчых арганізацый, якія павінны ўлічыць усю важнасьць пытаньня забесьпячэньня мясапрадуктамі рабочых цэнтраў. Аднак, даныя з месц гавораць аб тым, што загатоўчыя арганізацыі недаацэньваюць гэтага пытаньня, што іх работу не аддаецца належная увага з боку савецкай грамадзкасьці.

У красавіку план загатовак мяса выканан усяго толькі на 44,4 проц. У маі становішча некалькі палепшылася, выканаем выканалі план загатовак Магілёўская, Арданская і Гомельская акругі. За тое значна адсталі Бабруйшчына, Віцебшчына (62 проц.), Меншчына (63 проц.) і Мазыршчына (73 проц.).

У Жлобінскім раёне, Бабруйскай акрузе райкамы рассаюць усіх сваіх агентаў на загатоўцы мяса перакінуў на скаргу калгасаў. Старшыня Рагачоўскага калгасаў тав. Лазоўскі на запытаньне рабочай брыгады аб ходзе мясазагатовак, сказаў: «едзьце самі на раён, а мы не павінны быць хадулкамі для «Бамяса».

Пастанова ЦК аб забароне забою маладняка не выконваецца. Маладняк бязьлітасна знішчаецца. У Чырвонаармейскім раёне, Бабруйскай акрузе за 10 дзён з 20-га красавіка па 1-е мая забіта 625 шт. апойкаў, у Любанскім—1.08, у Старобінскім—1.014. Нягат калгасы забіваюць маладняк. На Менскую бойню дастаўлены для забою з калгасаў «Каміцэрні», імя Дзяржынскага, імя Сталіна, імя Молатава. Камісія ветэрынараў і заатэхнікаў прыйшла, що пераважная большасьць тых нязнатмагла быць выгадавана ў калгасах.

Пастанова эканомнарады і дырэктывы Наркамзу аб адводзе насьцьбішчаў для жывёлы не ажыцьцяўляецца.

Лічыцца выроблена, каб скарыстаць адходы бойні якія пры рацыянальным выкарыстаньні могуць у значнай ступені папоўніць дэфіцыт мяса.

Трэба яшчэ адзначыць, што груба парушаюцца дырэктывы аб эканомным выдаткаваньні мясапрадуктаў. У Рагачоўскім раёне Бабруйшчыны мяса выдадзена бяз ніякіх норм. Такое-ж становішча мы маем і ва Ўрэчыцы, Слуцкага раёну.

Праверка здалкаваньня мяса на Гомельскай акузе выявіла значныя перавышкі. Та напрыклад, транспартнае сьвяцкага таварыства, замест вызначаных па нормах 48 тон, выдала—66 тон, Гомельскі ЦРК замест 154 тон выдаў 203 тон, Веткаўскае т-ва замест. 2,5 тон—5,5 тн. Такі-ж малюнак у Аршанскай акузе, дзе Мсьціслаўскае спажывецкае т-ва выдала на 200 проц. мяса больш, чым трэба было. Зразумела, усе гэтыя справы перададзены ў пракуратуру.

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што мясцовыя органы безадказна адносяцца да пытаньня забесьпячэньня рабочых і служачых мясапрадуктамі.

І. К.

Як будзе сьвяткавацца 11 ліпеня

Акруговая камісія распрацавала плян сьвяткаваньня дня 11-га ліпеня—сьвята вызваленьня Беларусі ад белапалякаў.

3 1-га ліпеня ва ўсіх рабочых клюбах арганізуюцца ўрачыстыя вечары рабочых чырвонаармейцаў з дакладамі аб міжнародным становішчы і абароне краю. Акрамя таго арганізуюцца вечары ўспамінаў удзельнікаў барацьбы за вызваленьне БССР. Прафсаюзныя арганізацыі праводзяць збор сродкаў на пабудову самалёту імя «Дзеяцігодзьдзя вызваленьня БССР ад белапалякаў».

11-го ліпеня акрсавет Асоавіяхіму сумесна з камсамольскай арганізацыяй арганізуе ў Менску інсцэніроўку бою і абароны горада. Днём адбудзецца масавая дэманстрацыя працоўных горада. Вечарам культаддзел ЦСПСБ і акрсавет Асоавіяхіму арганізуюць у садзе «Прафінтэрн» валізаваны вечар. У гэты-ж дзень адбудзецца ўрачыстае адкрыцьцё кіно-тэатру «Чырвоная Зорка».

ПАЗЫКІ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ—СЭЗОННЫМ РАБОЧЫМ

Толькі 2,2 проц. пляну

Зрываецца рэалізацыя пазык сярод сэзоньнікаў

Цэнтральная камісія садзейнасьці дзяржкредыту пры ЦВК БССР заслухала даклады Наркамфіну і ЦП саюзу будаўнікоў аб разьмяшчэньні пазык сярод сэзоньнікаў. Як высьветлілася, ЦП саюзу на працягу двух месяцаў амаль нічога не зрабіла. Ніякай работы на распаўсюджаньні пазыкі сярод сэзоньнікаў не праводзіцца. Рад лічбаў сьведчыць аб зусім нездавальняючых выніках кампаніі па рэалізацыі пазык сярод сэзоньнікаў.

Па Бабруйскай акрузе рэалізавана 3.050 руб. пры кантрольнай лічбе ў 178.000 руб., па Гомельшчыне рэалізавана 15.000 руб. — пры кантрольнай лічбе ў 200.000, па Магілёўскай акрузе распаўсюджана аблігацый на 6.300 руб. пры кантрольнай лічбе ў 222.000; Мазырская акруга рэалізавала 865 руб. з 62 тыс. і г. д.

Усяго на 1 чэрвеня рэалізавана па БССР сярод сэзоньнікаў пазык на суму каля 31 тыс. руб., што складае 2,2 проц. кантрольнай лічбы.

Ні адна кампанія рэалізацыі пазык ня ведае такога ніякага процанту выкананьня пляну.

Правал кампаніі трэба тлумачыць толькі тым, што фінансавы апарат, крэдытныя установы, камісіі садзейнасьці і прафесыянальныя арганізацыі не адналі належнай увагі кампаніі і не разгарнулі работы. Напрыклад, у Менску, дзе будуюцца Ўсебеларуская выстаўка, клінічны і універсытэцкі гарадкі, фабрыка - кухня і дом ураду, — дагэтуль ніякай работы сярод сэзоньнікаў не праведзена. У Гомелі кампанія толькі знаходзіцца ў стадыі падрыхтоўкі. У Барысаве рабочая камісія садзейнасьці вельмі фармальна аднеслася да кампаніі, абмежаваўшыся разьмеркаваньнем кантрольных лічбаў.

А. Львоў.

Дырэктывы пад сукном

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). Кампанія рэалізацыі пазык сярод сэзоньнікаў толькі пачала разгортвацца, прычым тэмп яе вельмі павольны. Прычына позьняга разгортваньня кампаніі тлумачыцца тым, што райвыканком не надае кампаніі належнай увагі. Дырэктыва акрвыканкому цэлы месяц ляжала над сукном у РВК і толькі 20-га красавіка райкамісія садзейства разьмеркавала кантрольныя лічбы паміж арганізацыямі. Больш нічога ня зроблена. Ніякай іншай работы не праведзена. Партыйныя, прафесыянальныя арганізацыі і крэдытныя установы да кампаніі ня прыцягнуты і яны нічога ня ведаюць, што ім трэба зрабіць у справе папярэдняга пазыкі. Позьняе разгортваньне кампаніі сарвала рэалізацыю пазык на лесараспрацоўчых участках. Між тым, на райне было выдадзена лесарубам каля 1 мільёна зарплаты, і свачачасна можна было правесьці рэалізацыю на значныя сумы.

Падгорны.

У Віцебску кампанія сарвана

ЦП саюзу будаўнікоў атрымала тэлеграму з Віцебску аб тым, што з прычыны бязьдзейнасьці мясцовых прафарганізацый будаўнікоў зусім сарвана рэалізацыя пазыкі сярод сэзоньнікаў.

Мы ўчора ўжо паведамлялі аб тым, што заданьне па рэалізацыі пазыкі сярод сэзоньных рабочых выконваецца надзвычай дрэнна.

Неабходна, каб саюз будаўнікоў гораду Віцебску неадкладна узяўся за работу і нагнаў упушчанае.

За дзень

— 11-га чэрвеня ў Менск прыяжджае **швайцарская футбольная каманда**, запрошаная ВСФКБ для матчу са зборнай беларускай камандай.

— 15-га чэрвеня ў Гомелі адбудзецца **ўсебеларускі шахматна-шашачны турнір** на першынства па БССР. Турнір працягнецца 5 дзён.

— 20-га чэрвеня менакругком МОПР'у склікае **агульна-гарадзкую нараду актыву МОПР'у** па пытаньні аб падрыхтоўцы да дня 11-га ліпеня.

Зьнішчыць перагібы ў ападаткаваньні саматужнікаў

Абсьледваньне становішча саматужніцтва прамыслу ў БССР выявіла рад перагібаў у абкладаньні саматужнікаў падаткам.

Факты, сабраныя ў часе абсьледваньня, гавораць аб тым, што прыбытак асобным саматужнікам вызначаўся не на падставе матар'ялаў вывучэньня, а «на вока» самім інспэктарам. Частка саматужнікаў абкладзена прамнадаткам, як гандляры, паводле закону 13-га студзеня. Гэты закон меў мэтай адсеяць гандляроў ад катэгорыі саматужнікаў. На практыцы здарылася, што многія тыповыя саматужнікі абкладзены, як гандляры, па віне асобных фінпрацаўнікоў, якія лічылі за лепшае «пераабкласьці, чым недаабкласьці».

У Гомелі 9 проц. усіх саматужнікаў абкладзены паводле закону 13-га студзеня. 39 проц. іх абкладзены па прычыне «перавагі ў промысьле гандлёвай дзейнасьці».

Вось некалькі прыкладаў перагібаў у Гомельшчыне. Саматужнік Матусаў выробляе гузікі з грамафонных пласьцінак. Ён абкладзен, як гандляр. Чаму? У абежніку гаворыцца, што «нашыўка гатовых гузікаў на кардон ёсьць гандлёвая дзейнасьць». Матусаў таксама нашывае гузікі на кардон, але гузікі ўласнай выпрацоўкі. Апошняга інспэктар не ўважыў.

Саматужнік Аронаў выробляе коркі. Ён абкладзен, як гандляр, бо ў абежніку гаворыцца: «Мыцьцё гатовых коркаў—гандлёвая дзейнасьць».

Аронаў сапраўды мые коркі, але не гатовыя, а пасьля іх перапрацоўкі. Інспэктар з такімі дробязямі ня лічыцца.

Ёсьць факты яўнага парушэньня закону. У Гомелі ўсе майстры гадзіньнікаў былі абкладзены, як гандляры. Між тым, закон ясна гаворыць аб тым, што майстры гадзіньнікаў абкладваюцца ў процантных адносінах да звароту толькі пры ўмове, калі яны працуюць з наёмнымі рабочымі або з членам сям'і.

Ёсьць перагібы і ў выкананьні дырэктыў НКФ БССР, якія датычаць абкладаньня саматужнікаў па звароце.

У Гомелі ёсьць два прадпрыемствы, дзе сумесна працуюць 7 беднякоў саматужнікаў-краўцоў. Яны зьбіраюць усякае барахло—утыль, мыюць, чысьцяць і робяць з яго розныя рэчы. Кожнаму краўцу нельга працаваць ва ўласнай кватэры. Гэту работу трэба весьці ў асобным памяшканьні. Паколькі кожны ня мае магчымасьці наймаць асобнай майстэрні, краўцы працавалі ў адным памяшканьні. У мінулым годзе ўсе 7 краўцоў плацілі каля 300 р. падатку, у гэтым—каля 3.000 руб.

Гэтыя перагібы значна падарвалі пекаапэраваныя саматужныя промыслы. За апошняе паўгодзьдзе ў адным Менску закрылася каля 850 прадпрыемстваў—35 проц. агульнай колькасьці. Спыніў сваю дзейнасьць рад вельмі важных, каштоўных для народнай гаспадаркі промыслаў (аразумела, што вялікую ролю адыграў тут і недахват сыр'ю).

Праўда, частка некаапэраваных саматужнікаў пашла ў артэлі—у Менску на 1-ае кастрычніка мінулага году налічвалася 1.186 каапэраваных саматужнікаў, а на 1-ае красавіка г. г.—2.530. Але многія зусім кінулі саматужныя промыслы, перакваліфікаваліся, пайшлі ў вёску, перайшлі на наёмную работу і г. д.

Трэба як мага хутчэй выправіць памылкі ў абкладаньні. Пастанова ўраду СССР аб разьвіцьці саматужнай прамысловасьці, аб выпраўленьні перагібаў у абкладаньні павінна быць неадкладна ажыцьцёўлена.

З.

Усесаюзная аўта-вэлё-эстафэта

Да XVI зьезду ВсеКП(б) ВСФК СССР арганізуе ўсесаюзную аўта-вэлё эстафету. Мэта эстафэты — шырокая папулярызацыя сярод працоўных мас гораду і вёскі пытаньняў XVI партзьезду, прапагандавага пляну сацыялістычнага будаўніцтва, мабілізацыі ўвагі працоўных мас вакол выкананьня пяцігодкі ў чатыры гады, абароны краіны і папулярызацыі аўта-вэлё-спорту сярод працоўных мас.

Акрамя гэтага, удзельнікі эстафэты правядуць праверку выкананьня дырэктыў партыі аб перабудове фізкультурнага руху.

Усесаюзная аўта-вэлё эстафэта зьяўляецца вялікім палітычным мерапрыемствам, у правядзеньні якога павінны прыняць удзел шырокія масы савецкай грамадзкасьці. Удзельнікі эстафэты з усіх канцоў СССР прывязуць рапартвесткі аб ходзе сацыялістычнага будаўніцтва, выкананьні прамфінпляну, калектывізацыі сельскай гаспадаркі для перадачы іх зьезду партыі.

ВСФКБ арганізаваў цэнтральны штаб садзейнічаньня эстафэце. Пунктавыя штабы будуць арганізаваны на ўсіх перадатачных этапах эстафэты на тэрыторыі БССР. Ад БССР у эстафэце прыймуць удзел 35 фізкультурнікаў на 5 чал. на этап. Этапны маршрут выпрацаваны наступны: Менск, Самахвалавічы, Барысаў, Крушкі, Талачыно, Ворша, Дуброўна, Ляды і Красное. У Красном ад беларускай каманды эстафэту прыме каманда Заходняй Вобласьці, якая ў Мажайску зноў перадасьць эстафэту беларускім фізкультурнікам, якія павязуць яе ў Маскву.

Старт эстафэты беларускай каманды адбудзецца 28-га чэрвеня ў Менску на плошчы Волі, а 12 гадз. дня. Фініш — у Маскве 3-га ліпеня.

А. М.

Лугавы матылёк—найгоршы вораг

Станцыя аховы расьлін Беларускага навукова-дасьледчага інстытуту імя Леніна атрымала ад сваіх карэспандэнтаў весткі аб зьяўленьні на тэрыторыі БССР лугавога матылька.

Гэты найгоршы вораг нашых палёў летась у вялікай колькасьці зьявіўся ў Гомельскай, Бабруйскай і ў частцы Мазырскай акруг і прынёс вялікія страты сельскай гаспадарцы.

Сёлета ўжо ёсьць пэўныя весткі аб зьяўленьні шкодніка пакуль што в адным Кіраўшчарна раёну, Гомельскай акругі. Аднак, у зьвязку з тым, што мінулая зіма была спрыяючай для зімоўкі шкодніка, можна чакаць яго зьяўленьня ва ўсіх тых акругах, дзе ён наглядаўся раней.

Ня выключана магчымасьць зьяўленьня лугавога матылька ў дадзенай, дзе ў мінулым годзе яго ня было.

Зараз пачаўся лёт матылька. Ён адкладае маленькія таўставатыя лечкі, па тысячалісьнік, лебядзу, шчаўе, а таксама на канюшыну, лубін, віку і інш. расьліны. З лечак праз 5-6 дзён выходзіць маленькая цёмна-зялёная вусень, якая шкодзіць сельска-гаспадарчым расьлінам, пажыраючы іх. Калі своечасова ня прыняць рашучых мер, дык лугавы матылёк можа зусім зьнішчыць ураджай на значнай плошчы.

Адсюль зусім зразумела, што неабходна зараз-жа прыняць адпаведныя меры і падрыхтаваць да барацьбы з лугавым матылькам.

У сувязі з гэтым трэба ажыцьцявіць наступнае:

У тэрміновым парадку забясьпечыць раёны небясьпечныя ў адносінах шкодніка апаратурай і атрутамі.

Арганізаваць у саўгасах, калгасах і вёсках атрады на барацьбе з лугавым матыльком, прыцягнуўшы ў іх, у першую чаргу, членаў Асоавіяхіму, камсамольцаў, піянэраў, карэспандэнтаў станцыі аховы расьлін і інш.

Гэтым атрадам павінны мець патрэбную колькасьць апаратуры і атруты для барацьбы з вусенню. На іх абавязку сачыць за зьяўленьнем шкодніка і весьці з ім непасрэдную барацьбу.

Каб зьнішчыць шкодніка, рэкамендуецца ў часе лёту раскладаць агні, на якіх матылькі ляцяць і затым гінуць у вагні. Каб зьнішчыць лечкі трэба сачыць за месцамі, дзе яны адложаны, скашваць сарнякі, асабліва пасьля масавага лёту матылька.

Калі ўжо зьявілася вусень трэба капаць ахоўныя канавы для таго, каб ня дань магчымасьці шкоднікам перапаўзаць на незаражаныя яшчэ плошчы і зьнішчаць іх на месцах зьяўленьня, шляхам апыльвання і апырсканьня атрутай. Тэхніку па барацьбе са шкоднікамі, якія скончылі курсы Асоавіяхіму пры станцыі аховы расьлін і якія зараз працуюць у вёсцы, трэба выкарыстоўваць для інструктаваньня насельніцтва аб мерах барацьбы з лугавым матыльком.

Аб усіх выпадках зьяўленьня шкодніка неабходна паведамляць станцыю аховы расьлін па адрасе: Менск, Шырокая, 28.

К. АШУКІНА.

Тэатр і музыка

„Рыгалето"

(Белдзяржтэатр, 4 чэрвеня)

Опэра «Рыгалето» ёсьць досыць моцная сатыра на поравы і звычаі фэадальнае арыстакратыі канца сярэднявечча і пачатку новых вякоў. Яна бічуе асабліва тую безаглядную распусту, якая панавала сярод гэтае арыстакратыі. З пэўнымі папраўкамі і падчысткамі яна можа трымацца ў пэўным рэпэртуары нашага савецкага тэатру.

Затое з чыста музычнага боку ў ёй яшчэ вельмі моцна адчуваецца стары, так званы «расінізм» першае паловы XIX стагодзьдзя, калі ў ахвяру палучэньню, чыста знадворнаму характеру мэлёдыі прыносіўся псыхалёгічны зьмест дзеі.

У спэктаклі 4-га чэрвеня опэра была «вывезена» выключна двума артыстымі сьпеваракамі—Аляксашыным і Куцілек.

Артысты Аляксашын у загалоўнай ролі Рыгалето разгарнуў свае галасавыя магчымасьці непараўнальна шырэй, чымся ў папярэднім спэктаклі «Аіды», дзе ён выконваў ролю Амасаро. Прыгожы сакавіты голас артыста-рабіў добрае ўражаньне. На вялікую вышыню драматычнага мастацтва ўзьвіўся артысты-мастак у 3-яй дзеі, перадаўшы в вялікай глыбінёй трагізм перажываньняў старыка-бацькі ў вопратцы блазна. Шчырасьць і напружанасьць ігры ў гэтай дзеі відавочна эмацыра артыстага, бо ў апошняй дзеі ён ужо ня мог захаваць ранейшага ўздыму і правёў яе больш бледна.

Артыстка Куцілек чаруе звонкасьцю голасу, бездакорнай чыстатой інтанацыі ва ўсіх рэгістрах і досыць добрай тэхнікай клёратуры. Аднак, здаецца, тэхнічныя магчымасьці яе галасавога інструманту яшчэ далёка не разгорнуты да канца.

Сьпявак Лапаціп (герцаг) бязумоўна добрая музычная сіла, але ў паказе 4-га чэрвеня ён быў «ня ў голасе» з вакальнага боку і не ў настрої з драматычнага і ня даў тыпу вясёлага, распуснага тырана герцага.

Аркестр пад кіраўніцтвам маладога дырыжэра Сталярова гучаў наогул добра, чыста і іграў з уздымам. Але дырыжэр, мабыць, сам захапляўся гукавым бокам справы, і таму аркестр часта глушыў сьпеваку.

Трэба зьвярнуць увагу на распачалую базувальнасьць хору, на яго поўную няруховасьць; асабліва рэзка гэта кідалася ў вочы ў 3-яй дзеі, калі хор стаяў нібы нейкі няруховы «іконастас».

Ю. Дрэйзін.

Абураючы факт

У першых числах сакавіка месяца г.г., да апублікаваньня пастановы аб рацыяналізацыі прыватнікаў суднаў, Барысаўскім гаркамбінатам быў куплен у прыватніка мота-катэр, за які заплацілі 2.800 руб. Паводле прыбізных падлікаў, мота-катэр павінен быў з'эканоміць гужавыя выдаткі ў 1.500 руб. у год на перавозку цэглы і лесаматар'ялаў, належачых камбінату. Акрамя таго прадугледжвалася ліквідаваць тыя прастоі, якія адбываліся ў мінулыя гады э-за адсутнасьці тапажу.

Мота-катэр быў камбінатам адраманцаваны, для чаго быў пасланы чалавек у Ленінград, а таксама была куплена лайба за 1.325 руб., якую прыпаднялі з вады для абсушкі, для правядзеньня рамонту. Ужо рыхтаваліся пусьціць у работу мота-катэр і перавезьці цэглу для пабудовы чыгуна-гісэрнага заводу «Пралет. Молат», каб ня зрываць будаўнічай работы. Але ўмяшалася Барысаўскае аг-ва Дзяржпараходства, і атрымаліся зусім іншыя вынікі.

30-га красавіка а 19½ гадз. увечары, калі ўсе пайшлі ў рабклюб на ўрачыстае вечар, прысьвечаны 1-му мая, падехалі да нашага мота-катэру прадстаўнікі Барысаўскага Дзяржпараходства разам з начальнікам, зьнялі вартаўніка, вывернулі балты і ланцуг, якімі мота-катэр быў прымацаваны да электрычнага слупа, разарвалі боны, якія былі закладзены для затрыманьня лесу ад расплыву і забралі мота-катэр. Усё гэта было зусім нечакана для адміністрацыі камбінату.

Камбінат зараз-жа зьвярнуўся да пракуратуры і РСІ аб тэрміновым вырашэньні гэтага пытаньня, бо адсутнасьць сродкаў пераводзяць награжае зрывам будаўнічых работ. Але справа на сёньняшні дзень яшчэ ня вырашана.

Як-жа скарыстоўвае мота-катэр Барысаўскае Дзяржаўнае Параходства? Пасьля дзьвюх пераводзак э-за перагрузкі мота-катэр аламалі, і на сёньняшні дзень ён не рамантуецца. Прыпадзіятая лайба для абсушкі і рамонту таксама не рамантуецца, бо камбінат, ня будучы ўпэўненым у тым, што катэр адыдзець назад, ня хоча траціць сродкаў на рамонт лайбы, а з другога боку, Дзяржпараходства таксама яе не рамантуе. І ў выніку лайба канчаткова псуецца, знаходзячыся ў прыпадзітым становішчы.

ЛІБМАН.

З лістоў рабселькораў

НЯМА КІРАЎНІЦТВА

Дрэнна стаіць справа з рабкораўскім рухам у **Пятрыкоўскім** раёне, Мазырскай акругі. Няма ніякага кіраўніцтва рабселькорамі з боку райкому партыі і інш. арганізацыямі. Сходы, канфэрэнцыі і нарады рабселькораў не праводзяцца. У выніку такое работы насьцендазэта. У раёне выпускаецца дзе-ні-дзе. Ёсьць цэлы рад калгасаў і прадпрыемстваў, дзе зусім няма насьцендазет.

Райкому партыі трэба ўключыць у плян сваёй работы і работу з рабселькорамі.

А. Д.

НА АБАРОНУ КРАІНЫ

Сярод сялянства **Зімніцкага** сельсавету, Журавіцкага раёну (Магілёўшчына), селькорам **Юрчанка К.** пры дапамозе **Траянава С. і Сіняўскай Т.** сабрана на абарону краіны звыш 60 рублёў. З гэтай сумы 15 р. пераслана на імя рэдакцыі газэты «Зьвязда» для перадачы на пабудову самалёту. Рэшта грошай перадана Зімніцкай ячэйцы Асоавіяхіму. Збор сродкаў працягваецца.

Селькор Юрчанка заклікае ўсе ячэйкі Асоавіяхіму і актывістых пасьледваць яго прыкладу.

Ю.

НА ЗАПЫТАНЬНІ НЕ АДКАЗВАЮЦЬ

Адміністрацыяй Менскай акруговай ашладкасы не адказвае на запытаньні ўкладчыкаў. Так, у кніжку скаргаў і прапаноў заданна каля 32 розных запытаньняў, а адказана ўсяго на 10 запытаньняў. Ёсьць такія запытаньні, якія пішуцца па два разы, а адміністрацыя не адказвае.

Трэба зьвярнуць увагу на такую нядбайнасьць.

Кліент.

АГРАНОМЫ НЕ ДАПАМАГАЮЦЬ КАЛГАСАМ

Аграномы, якія працуюць у **Бягомльскім раёне**, не дапамагаюць калгасам. Так, аграном **Александровіч** М. любіць разьяжджаць, а калі прыедзе ў калгас і калгасьнікі задаюць пытаньні, дык яна адказвае: «Мне нямa часу» і з гэтым едзе дамоў.

У Бярэзіна-Лінскі калгас аграном Ул. **Александровіч** прыехаў толькі па наказ. Калі калгасьнікі пыталіся, што рабіць з сабраным попелам, дык ад агранома не атрымалі ніякага адказу. У калгасе ёсьць каля 130 пудоў попелу, які ляжыць бяз жаднага скарыстаньня, а калгасьнікі ня ведаюць, для якой мэты яго лепш скарыстаць.

У калгасах Бягомльскага раёну не наладжана рахункаводзтва. У раёне ёсьць тры куставыя аб'яднаньні з добрымі бухгальтарамі, але яны чамусьці не клапоняцца аб тым, каб чалавеціць справу рахункаводзтва. Бухгальтар Мсьціскага куста Рыўкін ня хоча дапамагчы, як правільна весьці рахункаводзтва ў калгасе «Беларусь». Рыўкін зьвяўляецца сы нам кулака, які ў гэтым годзе раскулачан.

Дрэнна адносяцца таксама да сваіх абавязкаў і некаторыя старшыні калгасаў, як напрыклад, старшыня Мсьціскага куста Сухараў. На запытаньні, як атрымаць пасенны авёс і лубін, ён адказаў: «гэта бяда не вялікая, па гэтым жыў будзеш».

Такія бюракратычныя паводзіны некаторых адказных працаўнікоў тармозяць выкананьне пасеўнага пляну.

БЕСПАРАДКІ НА ФАБРЫЦЫ

На фабрыцы **«Чырвоны Тэкстыльшчык»** (Менск) ня зусім добра стаіць справа з выкананьнем узятых на сябе абавязкаў па сацспаборніцтве. Значным тормазам у рабоце зьяўляецца тое, што вылучэнцам няма ніякага падтрыманьня ня боку адміністрацыі фабрыкі. Так, вылучылі тав. **Далічык** старшым па матальным цэху. Але ніхто не паказаў яму работу. У выніку, калі работніцы зварачаюцца да яе з запытаньнямі, што трэба памяншыць ход машыны, бо рвецца пража, дык тав. Далічык ня ведае, што рабіць. На падставе гэтага адбываюцца розныя непаразуменьні.

Маюць месца значныя прастоі, з прычыны нясправных машын. Так, першая камуна за **пяць** рабочых дзён вырабіла 11 кгр. пражы, гэта у той час, калі яшчэ павінна была вырабіць 43 кгр.

Ёсьць паасобныя работніцы, якія падрываюць работу. Напрыклад, матальшчыцы **Урман** не спадабалася, што яе далі пераматваць пражу. Пад выглядам «пратэсту» яна папсавала цэлую скрынку пражы. Аб гэтым паведамілі старшаму майстру Давідзон, але апошняя не паведаміла адміністрацыю, а ўрэшце і бракаваная пража зьнікла.

Рабочы.

***

Рабочыя фабрыкі **«Чырвоны Тэкстыльшчык»** распраўляюцца са злосьнымі прагульшчыкамі. За злосныя прагулы фабрычна-пралетарскі суд зьняў з работы дзьвюх работніц, а адну выключыў з членаў саюзу на тры месяцы і ўмоўна зьняў з работы.

Гэтымі днямі адбыўся сход вытворчых камун, на якім вынесена пастанова аб зьняцьці назвы ўдарнай камуны № 2 за прагулы і дрэнную якасьць работы.

Мясцком і вытворчая камісія яшчэ да гэтага часу ня выканалі пастановы суду і агульнага сходу камун.

РАБОЧЫ.

КАЛГАС ІМЯ ЦК КП(б)Б КАНЧАЕ СЯЎБУ

Калгас імя ЦК КП(б)Б **Голацкага** сельсавету, Сьмілаўскага раёну, заканчвае сяўбу. Зямлі ў гэтым калгасе — 240 гэкт., а колькасьцю 18 калгасьнікаў. Без дапамогі трактарнай калёны, якая існуе ў гэтым раёне, гэты калгас адсеяў наступныя культуры з колькасьцю пасяўу — 12.800 кл., ячменю — 1.114 кл., пшаніцы — 444 кл., канюшыны — 221 кл., ільну — 362 кл. і цімафэйкі — 3[illegible] кл. Заканчваецца сяўба бульбы, якой будзе засеяна больш 40 гэкт. Работа гэтага калгасу пастаўлена добра. Нарады работы калгасьнікам даюцца вечарам. Дружная работа калгасьнікаў выклікае жаданьне бядняцка-сераднянцкіх гаспадарак уступаць у калгас.

З боку праўленьня нічога ня было зроблена для заключэньня сацспаборніцтва з другім калгасам. Але рэвізійная камісія дала наказ тэрмінова гэта зрабіць, што зараз і выконваецца. За кароткі час свайго існаваньня калгас імя ЦК КП(б)Б зьявіўся паказальнай формай сацыялістычнай сельскай гаспадаркі на тэрыторыі Голацкага сельсавету.

Яээп.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ

Дом Камасьветы. У пак. № 21 індывідуальная кансультацыя па эканомпалітыцы, матэматыцы і фізыцы.

— У пак. № 3—запяткі гуртку нямецкай мовы. Пач. а 6 гадз. веч.

Мэдсэкцыя Белтарнітса зьбіраецца а 7 гадз. веч. у дзканапе мэдфаку.

ЦК ЛКСМБ. У памяшк. ЦК ЛКСМБ адбудз. пасяджэ. КК ЦК ЛКСМБ. Яўка ўсіх членаў КК ЦК абавязк. Выклікаюцца на пасяджэ. па сваіх справах наступныя т. т.: Харкевіч Я., Нісэнбаум С., Ліўшыц Я., Дзергачоў, А., Масалкоў, Масаловіч, Сідаровіч З., Хадановіч А., Арцёменка—Ворша; Гэрман Л., Кавалёва, Васількова, Кормаў А., Вашлакоў—Гомель; Слуцкі Р., Казак З., Ізаматава, Альшыц С., Емельянава Е., Альдэнбэргер Г., Буевіч С., Салаўёў—Віцебск. Праезд за свой кошт. Пач. а 12 гадз. дня.

ЗАЎТРА

Мясцком хатніх работніц № 2. У памяшк. клюбу парфарч (Энгельса, 6) адбудз. агульны сход хатніх работніц. Яўка абавязк. Пач. а 7 гадз. веч.

Тэрапэўтычная сэкцыя. Чарговае пасяджэ. тэрапэўтычнай сэкцыі навуковай асацыяцыі адбудз. у аўдыторыі сухотнага інстытуту (уваход з Інтэрнацыянальнай). У парадку дня: 1) дэманстрацыя хворых, 2) даклад д-ра Гурвіца «Біялёгічная рэакцыя Анегейм-Зондэка для раньняй дыягностыкі цяжарнасьці і значэньне яе ў клініцы сухот», 3) бягучыя справы. Запраш. члены акупэрскай гінекалёгічнай сэкцыі. Пач. а 9 гадз. веч.

ПАСЬЛЯЗАЎТРА

Фрунзаўскі РК КП(б)Б. У памяшк. АК КП(б)Б (зала пасяджэ., 3-ці паверх) адбудз. раённая нарада кіраўнікоў сэкцыяў партвучобы па пытаньні аб ходзе падрыхтоўчай працы, па арганізацыі гурткоў, па прапрацоўцы зьезду і аб сетцы партвучобы на 1930-31 год. На нараду павінны зьявіцца ўсе кіраўнікі гурткоў. Яўка абавязк. Пач. а 6 гадз. веч.

АД КУЛЬТПРОПУ МЕНАКРУГКОМУ КП(б)Б

15-га чэрвеня, а 10 гадз. ран., адбудзе акруговая нарада культпропу з наступным парадкам дня:

1. Задачы прапаганды марксізму-ленінізму ў сувязі з чарговымі задачамі партыі (дакл. т. Камэнштэйн);
2. Вынікі партасьветы ў акрузе за 1929-30 навуч. год (дакл. Гарэлік).
3. Аб сыстэме масавай партасьветы ў горадзе і вёсцы на 1930-31 пав. год (дакл. Орліс). Судаклад АК ЛКСМБ.
4. Аб сыстэме тэарытычнай вучобы актыву на 1930-31 год (дакл. т. Модзель).

На нараду выклікаюцца загадчык АПА 1 Культпропаў РК, раённыя прапагандыстыя, заг. АПА РК ЛКСМБ па гораду і рэйну, заг. сэкгараў партвучобы ячэек менскай гарадзкой арганізацыі.

Канфэрэнцыя працягнецца тры дні 15-17 чэрвеня.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

Тэатр саду „Прафінтэрн"

Мастацкі перасовачны тэатр „КРАСНЫЙ ФАКЕЛ"
Сёньня, 9 чэрвеня, для чл. саюзу саўгандальслуж.
„Человек с портфелем"
Білеты ў раб. касе. Ястача білетаў у касе саду
Пачатак а 8 г. 30 м. веч.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР
Гастролі 1-га Маскоўскага перасовачнага тэатру ОПЭРЫ І БАЛЕТУ
Сёньня, 9 чэрвеня „ПИКОВАЯ ДАМА" Білеты ў касе тэатру і раб. касе
Пачатак а 8 г. 30 м. веч.

КІНО-САД (Савецкая, 71)
СЁНЬНЯ 9 чэрвеня Кіно-сад ЗАКРЫТ
ЗАЎТРА 10 чэрвеня Новая праграма

КІНО Пралетары
СЁНЬНЯ 9 чэрвеня Кіно „ПРАЛЕТАРЫ" ЗАКРЫТА
ЗАЎТРА 10 чэрвеня Новая праграма

1-ы Менскі кіно-тэатр „Юны Піянэр"
СЁНЬНЯ 9 чэрвеня Кіно „ЮНЫ ПІЯНЭР" ЗАКРЫТА
ЗАЎТРА 10 чэрвеня Новая праграма

ЭЛЬВОД
ПАВЕДАМЛЯЕ АБАНЭНТАЎ, што, згодна загаду ВСНГБ, абвешчанага „Савецкая Беларусь" ад 22 сакавіка г. г.
— ЭЛЬВОДАМ —
зьбіраюцца ў абанэнтаў шчотчыкі
для праверкі ў палаце мер і вагі.
На зьбіральцы шчотчыкаў мэнаджэры маюць адпаведныя пасьведчаньні Абанэнтам, якія будуць перашкаджаць зьбіральцы шчотчыкаў, СПЫНЕНА ПАДАЧА ЭЛЕКТРАЭНЭРГІІ
БУДЗЕ

ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ
на завочны пэдфак пры пэдфаку БДУ на 1930-1931 навучальны год.
Завочны Пэдфак, які існуе другі год, мае наступныя аддзяленьні: 1) сацыяльна-гістарычнае, 2) палітыка-асьветнае, 3) літаратурна-лінгвістычнае і 4) пэдолёга-педагагічнае. Тэрмін навучаньня на ўсіх аддзяленьнях 3-гадовы.
На сацыяльна-гістарычным і літаратурна-лінгвістычным аддзяленьнях адчыняецца яўсэкцыя.
У гэтым навучальным годзе будзе прынята на I курс сацыяльна-гістарычнага аддзяленьня 150 асоб, палітыка-асьветнага—150, літаратурна-лінгвістычнага—150 і пэдолёга-педагагічнага—50.
Прымаюцца на завочны пэдфак настаўнікі, рабочыя ад варштату, батракі, калгасьнікі, сялянe-бядняки і серадняки, маючыя сярэднюю асьвету.
Навучаньне дармовае. Прыём адбываецца бяз іспытаў.
Асобы, якія жадаюць паступіць на завочны пэдфак, падаюць аб гэтым заяву на імя прыймовай камісіі завочнага пэдфаку і прыкладаюць да яе наступныя дакументы:
1) Анкету завочнага пэдфаку, пасьведчаную адпаведнай савецкай установай або прафсаюзнай арганізацыяй.
2) Дакумент аб асьвеце.
3) Дакумент аб месцы працы.
Заявы прымаюцца з 15 чэрвеня па 15 жніўня.
Анкета завочн